PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl

№ 2 (2435) Год XLVIII Беласток, 12 студзеня 2003 г. Цана 2,00 зл.

„Талака” ў Інтэрнэце
— http://talaka.prv.pl

Размова з Аляксандрам НАВІЦКІМ, перакладчыкам і журналістам Беларускай службы Радыё Палёнія, заснавальнікам інтэрнэтнага Радыё Талака.

— Адкуль узялася ідэя зрабіць беларускае радыё ў Інтэрнэце?

—Ідэя не мудрагелістая, бо ў мяне было шмат беларускай музыкі, якую я люблю слухаць. Спачатку я нават не ведаў, што гэта будзе Радыё Талака, спадзяваўся, што гэта можа быць нейкі форум. Сама ідэя радыё прыйшла пазней. Я крыху аб гэтым чытаў, але як дзейнічае — не ведаў. Калі ўжо знайшоў адпаведную дакументацыю, адпаведныя праграмы, стварыў у сябе сервер і пачаў вяшчаць. Праўда, магутнасць гэтага радыё невялікая, але асноўная ідэя была прыблізна такая, як у слове „талака”, у традыцыі Талакі. Самая назва мяне натхніла з арганізацыі Талака, якая існавала ў Мінску калісьці, пад канец васьмідзесятых гадоў. Я ўдзельнічаў у некаторых мерапрыемствах Талакі. Талака гэта стары вясковы звычай. „Зрабіць усёй талакой”, значыць зрабіць супольна. Сёння мы цэлай вёскай збудуем суседу клуню, а заўтра ён нам, напрыклад, паставіць плот. Такая супольнасць, думаю, патрэбная беларусам, тым больш, што іх мала. Яны адчуваюць сябе найчасцей самотнымі, нават тыя беларускамоўныя ў Беларусі. І ў Польшчы жыве многа людзей, якім можа бракаваць размоў на сваёй мове ці беларускай музыкі. А ў мяне якраз беларускай музыкі многа. Тым часам на нашай старонцы можна не толькі слухаць музыку, заказваць яе, але таксама размаўляць і сябраваць. Цяпер радыё ўвогуле не зарабляе. Але магло б. Маёй марай з'яўляецца, каб людзі згадзіліся на гэтае кліканне. Тады кожнаму гурту, раз на год, можна было б даць хаця сімвалічныя 10 долараў. Разумею, што гэта не вырашае праблемы ганарараў беларускіх музыкаў і яны напэўна не разлічваюць на Радыё Талака, але гэта было б для мяне нейкім удзелам у беларускай справе.

— Як зараз дзейнічае Талака?

— Гэта толькі музыка ўвесь час і рэакцыі на некаторыя лісты. Слухачы часта пытаюць, чаму не гучыць радыё. А яно проста не гучыць увесь час. Я выходжу з таго, што яно павінна гучаць як найдаўжэй, штодзённа, але па-рознаму выходзіць. Калі мая сітуацыя крыху зменіцца, калі куплю сабе новы камп'ютэр, які працаваў бы як сервер. Аднак гэта даволі цяжкія пытанні. Талака можа назаўсёды застацца на ўзроўні такога камернага радыё. Слабое злучво не дазваляе, каб Талаку слухала, напрыклад, тысяча людзей.

[працяг ☞ 2]

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вучні Падставовай школы н-р 6 з настаўніцамі Людмілай Грыгарук (на першым плане) і Гражынай Паўлючук

Цікавасць да беларускай мовы

У Комплексе школ па вуліцы Новаваршаўскай у Гайнаўцы ў снежні 2002 года арганізаваны былі „Адкрытыя дні школы”. Маглі яе наведаць бацькі, вучні іншых школ і жыхары Гайнаўкі. На калідорах арганізаваны былі выстаўкі, на якіх паказваліся дасягненні вучняў у розных галінах. Бацькі маглі прыйсці на ўрокі і паглядзець як вучаць іхных дзяцей.

З верасня 2002 года, у параўнанні з мінулым школьным годам, на 80 асоб пабольшала колькасць навучэнцаў беларускай мовы. Зараз беларускай мове вучыцца 126 вучняў Падставовай школы і 99 гімназістаў. Апошнім часам у Падставовай школе пачалі ствараць асобны клас, у якім прадбачваецца навучанне беларускай мовы. Пазней вучні гэтага класа будуць вучыцца роднай мове ажно да заканчэння вучобы ў школе. Старэйшым вучням, якія выявілі ахвоту вучыцца беларускай мове, ствараліся міжкласныя групы. Найбольш новых ахвотных вучыцца беларускай мове паявілася сярод гімназістаў, якія намерваюцца паступіць у Гайнаўскі белліцэй.

— Большая чым у мінулым годзе колькасць навучэнцаў беларускай мовы, гэта заслуга настаўніцы Людмілы Грыгарук, — заяўляе дырэктар Ірэна Кулачэўская. — Уплыў маюць таксама выезды нашых вучняў у Беларусь і візіты беларускай моладзі ў нашую школу.

У школьным будынку выдзеленае асобнае памяшканне, куды вучні і бацькі прыносяць старыя прылады працы, вышываныя ручнікі, макаткі і ткацкія вырабы. Настаўніцы Гражына Паўлючук і Людміла Грыгарук рыхтуюцца да адкрыцця школьнага музея, прымеркаванага да рэалізацыі аўтарскай праграмы рэгіянальнай адукацыі рыхтаванай Гражынай Паўлючук. У бібліятэку куплены новыя камп'ютэры. З восені 2002 года арганізуецца ў школе выдача абедаў. Рыхтуюцца яны ў Падставовай школе н-р 2 і давозяцца ў школьную сталовую, якая знаходзіцца ў святліцы. Была яна прыстасаваная для харчавальных патрэб з дапамогай бацькоў і спонсараў. Некаторыя сродкі выпрацавала школа, наймаючы памяшканні для гандлёвых прадпрыемстваў. Аднак колькасць вучняў, якія могуць карыстацца абедамі абмежаваная (зараз 233 асобы). Дырэктар Ірэна Кулачэўская плануе пабудаваць пры школе кухню і сталовую.

Настаўніца Гражына Паўлючук арганізавала сваім вучням экскурсіі па наваколлі. На яе ўроках дзеткі знаёмяцца з беларускімі прыказкамі, спяваюць праваслаўныя калядкі. У час урокаў беларускай мовы вучні любяць слухаць цікавыя расказы і спяваць песні.

— Стараюся арганізаваць многа гульняў, у час якіх знаёмлю дзяцей і моладзь з беларускай мовай. Нашыя вучні прымалі ўдзел у экскурсіі ў Брэст, яго наваколле, наведвалі Беларускі музей у Гайнаўцы, — кажа настаўніца Людміла Грыгарук. — У мяне добрыя суадносіны з вучнямі і бацькамі. На некаторых уроках вучні чытаюць „Зорку” і глядзяць беларускамоўныя мультфільмы. Добра было б, каб беларускія арганізацыі наладжвалі ў Гайнаўцы „ёлку” і іншыя беларускія мерапрыемствы, якія маглі б зацікавіць вучняў.

Аляксей МАРОЗ

Шкляная святочная пагода
☞ 3

Своеасаблівую ролю адыгрывала ў гэтыя святы прэзідэнціха. Паяўлялася яна (часам нават і ў камерцыйных тэлеканалах) быццам Дзед Мароз — каб не мяшаць сюды і Святога Мікалая — як Першая дама, якая нясе дапамогу хворым дзецям. Калі тэлегледачы заселі абедаць у першы дзень свят, атрымалі на закуску амаль паўгадзінны рэпартаж аб ёй.

Вінцук Гадлеўскі — святар і палітык
☞ 4

Гадлеўскі жыў ідэяй аб'яднання ўсіх беларусаў вакол нацыянальнага і дзяржаўнага будаўніцтва. Быў перакананы, што народы могуць развівацца і паспяхова будаваць сваю будучыню толькі ў сваёй дзяржаве, але дзеля гэтага патрэбная супольная нацыянальная ідэя, без якой не магло быць вартаснай літаратуры, навукі, мастацтва ні цывілізацыйнага прагрэсу.

Масавы ўдзел
☞ 5

У школьных элімінацыях IX выпуску Алімпіяды беларускай мовы прыняло ўдзел каля 170 белліцэістаў Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Да школьных спаборніцтваў прыступілі амаль усе вучні чацвёртых класаў. Белліцэісты адказвалі на пытанні па гісторыі беларускай літаратуры і пісалі сачыненне.

Іконы ў жаласным стане
☞ 9

Як вынікае з архіўных крыніц, абразы для шчытоўскай царквы пісаў прыдворны мастак Браніцкага Аўгустын Мірыс, фламандзец, які жыў у Беластоку. Калі камергер Вангерскі пабудаваў сваім вернікам царкву, ейны парах задумаў упрыгожыць храм іконай Пакровы Прасвятой Багародзіцы, паехаў да Мірыса і заказаў ікону.

Дачка сказала: не!
☞ 9

Вясковая пацыентка, адпачыўшы, хутка прыйшла ў сябе. Выпрасталася, адкінула палку. Каб так нехта з боку глянуў, дык мог бы падумаць, што нічога ёй і не баліць. Я вырашыла, што пасля нядзелі, гэта значыць пасля двухдзённага адпачынку ад практыкаванняў, я зраблю ёй здымак і яшчэ пагутарым больш грунтоўна...

Лёня не прыйшоў
☞ 10

Немцы акружылі зямлянку. Пачаўся няроўны бой, у якім загінуў Лёня. Партызаны яшчэ доўга заходзілі да Лёневых бацькоў і суцяшалі: „Не волнуйтесь, Лёня скоро прийдёт”. Але Лёня не прыйшоў.

Беларусь — беларусы

Ускладніцца гандаль з Польшчай

30 снежня 2002 г. у Мінску адбылася прэс-канферэнцыя міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Міхаіла Хвастова для айчынных і замежных журналістаў. У ходзе канферэнцыі закраналася справа адносін з Польшчай.

Пытанне: ***Еўрапейскі Саюз расшыраецца коштам нашых бліжэйшых суседзяў. Як Вы лічыце, ці ўступленне нашага суседа Польшчы ў ЕС створыць для Беларусі дадатковыя шансы, ці дадатковыя клопаты?***

Міхаіл Хвастоў: У пэўным сэнсе, канешне, расшырэнне ЕС створыць як акрэсленыя перавагі, так і пэўныя складанасці для дзяржаў, якія не з'яўляюцца членамі гэтай арганізацыі. Ствараючы Еўрапейскі Саюз, яго заснавальнікі перш за ўсё ставілі перад сабой мэту — расшырэнне эканамічнай прасторы і ўстанаўленне аднолькавых норм, правіл, гандлёвых прынцыпаў, перш за ўсё мытных збораў, пошлін, падаткаў. Канешне, істотным чынам ускладніцца наш гандаль з Польшчай у выпадку ўступлення гэтай краіны ў ЕС. Польшча як новая краіна-член ЕС абавязана будзе прыняць тыя прынцыпы і падыходы, якія сёння выкарыстоўваюцца краінамі Еўрапейскага Саюза ў адносінах да Беларусі. Гэта, перш за ўсё, антыдэмпінгавыя меры ў адносінах да калійных удабрэнняў, тэкстылі, штучных нітак і шэрагу іншых тавараў.

Другое — ахова польскага рынку істотным чынам ускладніцца, г.зн. польскі бок ускладніць працэдуры, і, канеше, установіць новыя элементы аховы свайго рынку. Зразумела, што будучы членам Еўрапейскага Саюза, яна павінна аказваць акрэсленыя прывілеі перш за ўсё краінам ЕС. Але, з другога боку, гэты працэс абаюдны. Эканоміка не можа развівацца ў закрытай сістэме. Гэтыя тавары, якія сёння выпускаюцца ў Польшчы, па-даўнейшаму будуць карыстацца попытам і ў Беларусі, і па-за яе межамі — у Расіі і іншых краінах СНД, і ва ўсім свеце. Такім чынам, Польшча аб'ектыўна будзе зацікаўлена ў тым, каб прадаваць свае тавары, і мы будзем весці перагаворы па спрашчэнні працэдур гандлю з Польшчай. Мы ўжо пачалі такія перагаворы, вядзем іх на ўзроўні намесніка міністра замежных спраў Аляксандра Міхневіча. У апараце Урада за гэтыя справы адказвае намеснік прэм'ер-міністра Андрэй Кабякоў. І мы знаходзім зразуменне па супрацоўніцтве ў галіне сельскагаспадарчай вытворчасці. Працэс гэты перагаворны. Але тое, што сітуацыя ўскладніцца і для палякаў, і для нас, гэта натуральна. www.mfa.gov.by

Візіт віцэ-міністра МЗС Беларусі ў Польшчу

У рамках падрыхтоўкі да правядзення дзевятага пасяджэння Змешанай беларуска-польскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве (г. Варшава, 16-17.01.2003 г.) намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь — намеснік старшыні Змешанай камісіі Аляксандр Міхневіч 20 снежня 2002 г. сустрэўся з першым намеснікам міністра гаспадаркі Польшчы — старшынёй Змешанай камісіі Анджэем Шараварскім.

У ходзе сустрэчы была ўзгоднена павестка дня маючага адбыцца пасяджэння Змешанай камісіі, абмеркаваны ўзровень двухбаковых сустрэч, а таксама шэраг канкрэтных праектаў двухбаковага супрацоўніцтва.

21 снежня 2002 г. Аляксандр Міхневіч сустрэўся з намеснікам міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі Польшчы — старшынёю польскай часткі беларуска-польскай Міжурадавай камісіі па справах трансгранічнага супрацоўніцтва Зянонам Касіняк-Камышом і намеснікам міністра замежных спраў Польшчы Анджэем Залуцкім. У час сустрэч абмяркоўваліся пытанні маючага адбыцца ўвядзення візавага рэжыму, падпісання дамовы аб дзяржаўнай мяжы, а таксама іншыя пытанні двухбаковых адносін. www.mfa.gov.by

Спадарыні **Яніне Чэрнякевіч**, шматгадовай рэдактар „Зоркі", словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага Яе гора — **смерці Мужа** — выказвае рэдакцыйны калектыў „Нівы".

Паслякалядны роздум

Адной з цікавых адметнасцей Беларусі з канца мінулага стагоддзя стала існаванне ў яе святочным календары дубляваных дзяржаўных свят. Зразумела, што такія святы звязаныя з рэлігіяй.

У разгар перабудовачнага працэсу калі людзі пачалі адкрыта святкаваць Раство і Вялікдзень, а таксама іншыя царкоўныя святы, было вырашана надаць ім статус дзяржаўных і адпаведна зрабіць выхаднымі днямі. Аднак у той жа момант перад заканадаўцамі — на той час дэпутатамі Вярхоўнага Савета — узнікла пытанне: якой з канфесій, што мелі найбольш адметны адбітак у гістарычным жыцці беларускага народа, адносіцца больш паважліва.

Сапраўды, першай на тэрыторыю сучаснай Беларусі прыйшло хрысціянства ўсходняга абраду — праваслаўе. Але затым пры пэўных варунках, часцяком трагічных, беларусы, асабліва шляхецкага роду, сталі пераходзіць у каталіцтва. Пры падзелах Рэчы Паспалітай у XVIII стагоддзі большую частку беларускага насельніцтва складалі уніяты. А непасрэдна праваслаўнае насельніцтва было ў той час у Беларусі рэлігійнаю меншасцю.

Далучэнне беларускіх земляў да Расіі стала свайго роду праваслаўным Рэнесансам на гэтай тэрыторыі, што, зразумела, мела сваё гістарычнае абгрунтаванне. І ў рэшце рэшт праваслаўныя сталі складаць большасць, а каталікі разам з уніятамі (якія, дарэчы, у хуткім часе ўвогуле амаль зніклі) меншасць.

Кастрычніцкія падзеі 1917 года і наступіўшыя затым змаганні з рэлігіяй ураўнялі і тых, і другіх. Як ксяндзы, так і бацюшкі трапілі пад колы дзяржаўных бязбожных рэпрэсій, а храмы абедзвюх цэркваў пераўтвараліся часцяком у пабудовы гаспадарчага альбо ўвесяльнага кшталту. З часам былыя прыхаджане, а таксама іх нашчадкі не адчувалі сябе ўжо ні каталікамі, ні праваслаўнымі. Затое абвяшчалі сябе атэістамі, пры поўнай таямнічасці ахрышчываючы сваіх дзяцей дзе-небудзь на вёсцы.

Такім чынам, да пачатку 1990-х гадоў абедзьве найвялікшыя цэрквы на Беларусі аказаліся амаль у роўным разбураным стане. І менавіта адраджэннем, а значыць барацьбой за душы былых атэістаў былі заняты яны ўсе апошнія гады. Пастаўленне і Праваслаўнай царквы, і Каталіцкага касцёла ў роўныя ўмовы стала адным з галоўных чыннікаў тых дзеянняў улады, бо прадухілілі розныя магчымыя спекуляцыі і нават канфлікты на рэлігійнай глебе, што, дарэчы, неаднаразова адбывалася ў беларускай гісторыі. Таму і аказалася, што вызначэнне за дзяржаўныя святы 25-га снежня і 7-га студзеня (Нараджэнне Хрыстова па абодвух календарах) нясе ў сябе тое, што называецца дзяржаўнай мудрасцю. Бо зусім не так важна, калі святкаваць такое важнае царкоўнае свята, а значна важней, каб грамадзяне Беларусі розных канфесій не адчувалі сябе няўтульна ў рэлігійным плане. Дзяржава ж тым часам заставалася цалкам свецкай і не ўмешвалася ў рэлігійнае жыццё.

На жаль, падзеі апошняга году выявілі даволі небяспечную тэндэнцыю ў адносінах цяперашняй беларускай улады да веравызнання яе грамадзян. Не сакрэт, што Праваслаўная царква за апошнія гады адрадзіла былы аўтарытэт сярод насельніцтва, што, дарэчы, не было за цяжка. Але ўвачавідку стала праяўляцца жаданне выкарыстаць гэты аўтарытэт сённяшнімі уладу трымаючымі асобамі. Новы закон „Аб свабодзе веравызнання" прыняты летась стаў прычынай для хваляванняў аб магчымасці адпраўляць свае абрады рознага кшталту пратэстантам, якія ўбачылі ў ім абмежаванне сваіх правоў. І хаця гэты закон у многім папросту замацоўвае на паперы сапраўдны стан рэчаў і тое, што Праваслаўная царква мела найбольшы ўплыў на фармаванне беларускай нацыі, паўстае пытанне: чаму сённяшнія ўлады Беларусі афішавана жадаюць гэта падкрэсліць? Больш таго, прэзідэнт Лукашэнка напрамую заявіў аб тым, што ён не дапусціць расколу Праваслаўнай царквы, зважаючы на жаданне некаторай часткі святароў узмацніць пазіцыі Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, што не падпарадкоўваецца Маскоўскаму Патрыярхату.

Менавіта гэтыя чыннікі ўсяляць апасенне, што менавіта аўтарытэт Праваслаўнай царквы можа быць выкарыстаны цяперашняй беларускай уладай выключна ў мэтах свайго ўмацавання. А калі зважаць на тое, што на языках, якія распавядаюць аб парушэннях правоў чалавека ў Беларусі, „нацёрліся мазалі", то такое выкарыстанне можа прывесці да заканчэння перыяду верацярплівасці.

А шкада, бо ўсё так добра пачыналася...

Уладзімір Лапцэвіч

„Талака" ў Інтэрнэце

[1 ☞ працяг]

— Радыё Рацыя спыніла дзейнасць з-за адсутнасці грошай. Адкуль бяруцца грошы на Талаку?

— Гэта не каштуе ніякіх грашэй, а толькі мой час. Але так увогуле гэта арганізацыя нон-профіт, недаходная. Я не збіраюся зарабляць на Радыё Талака, бо і вялікіх грошай не заробіш на гэтым. Проста хацелася б, каб у Інтэрнэце існавала беларуская музыка.

— Зразумела, Талака — хутчэй аматарскае радыё, але я веру ў тое, што ангажаванасць заўзятара — лепшы за халодны прафесіяналізм. Ці ў час, калі падаюць беларускія радыёстанцыі не думаў ты аб тым, каб сарганізаваць вялікае інтэрнэтнае радыё?

— Думаў. Але я слаба ўяўляю сабе гэта. Па-першае трэба было б зарэгістраваць нейкую арганізацыю, якая магла б прасіць датацыі ці іншай дапамогі. Не ўпамінаючы ўжо пра тое, ці ўвогуле знайшліся б такія спонсары, гэта ўжо не толькі час, але і грошы. Гэта было б дорага. Я ведаю многа іншых інтэрнэтных радыё. Яны або, як Талака, маюць нямнога верных слухачоў, сяброў, або гэта вялікія радыёстанцыі, што маюць багатага спонсара, якому залежыць, каб радыё існавала, і каб пра яго, спонсара, добра гаварылі. Аднак адна асоба гэта замала, каб весці радыё. На старонцы Талакі ёсць аб'ява аб тым, што шукаю супрацоўнікаў. Пакуль што, ёсць прапановы супрацоўніцтва, але не зусім такія, якія падыходзілі б мне. Я больш разлічваю на тое, каб хтосьці рэтрансляваў мой сігнал. Патрэбныя людзі, якія маюць пастаянны доступ у Інтэрнэт, а ў Беларусі такіх людзей мала. Патрэбныя таксама энтузіясты, якія маглі б нешта свайго ўнесці. Я магу так запраграмаваць, каб музыка іграла, дапусцім, ад дзевятай гадзіны раніцы да адзінаццатай вечара, але тады не будзе ўжо такой інтэрактыўнасці. Наконт супрацоўнікаў — я памяркоўны аптыміст, бо робячы не першы ўжо беларускі праект у Інтэрнэце бачу, што беларускіх патрыётаў, і адначасова людзей з ідэяй мала. Дарэчы, праз некалькі гадоў маю намер купіць і лепшае злучво ў Інтэрнэт, і новы сервер. І тады можна будзе думаць пра нешта большае за камерны клуб беларускіх аматараў добрай музыкі.

— Самае важнае, калі ідзе пра радыё, гэта музыка...

— У Талацэ гучыць не толькі беларуская музыка. Бываюць, напрыклад, „польскія дні". Ёсць таксама добрая, прыгожая музыка з іншых краін свету. Няма толькі рускай мовы. Не таму, што я не люблю яе, а таму, што беларускі слухач з Беларусі мае дастаткова такой музыкі навокал сябе — навошта яшчэ ў Інтэрнэце мае яе чуць? Ды і няма ў мяне такой музыкі. Я ўважаю Расію за такога суседа, які прыехаў пагасцяваць і забыўся ад'ехаць.

— А па жанры — якая гэта музыка?

— Такая, якую я люблю. Гэта мяшанка і бардаўскай музыкі, і рока, зрэшты ў беларускай музыцы ўсё гэта моцна пераплятаецца. Той жа Лявон Вольскі — раз бард, раз рокмен, а раз, проста, аўтар добрых тэкстаў. Бываюць у Талацэ і ўплывы джазу. Амаль кожны знойдзе тут нешта для сябе.

— А чаму старонка напісана беларускай лацінкай?

— Я люблю лацінку. Шкада, што яна адсунутая на абочыну. Не веру ў тое, што лацінка калісьці зможа быць у нашай мове нароўні з кірыліцай, але калі магу падтрымліваць прысутнасць у Інтэрнэце беларускай мовы, беларускай музыкі, дык чаму ж не беларускай лацінкі? Яна ж таксама нашая. Другая прычына больш празаічная, бо няма ў мяне клавіятуры з кірыліцай. Аднак гэта, відаць, вынікае з першай часткі адказу.

Запісала Зося Лемеш

Вачыма паляка

Шкляная святочная пагода

Можа кагосьці настрою супраць сябе, але не балдзею я ад калядных свят і „Сільвестра". Ну, можа, і не так зусім, але не пераношу падрыхтовак да іх і скрыгічу зубамі на святочную тэлевізійную прапанову, асабліва публічнай TV. На мінулае Божае Нараджэнне па грыгарыянскім стылі ў падарунку чаргова і ўперамешку, часам у той самы час, „Адзінка", „Двойка" і „Тройка" прабавалі што і раз прымусіць нас да сустрэч з прэзідэнтавай Аляксандравай Кваснеўскай і штораз больш прамаўляючай, а не спяваючай Марыляй Радовіч. Ужо святочнай традыцыяй стала, што на першым і другім плане паяўляецца шэфіха II праграмы TVP Ніна Тарэнцьеў, а і галоўнай прэзенцёркі Агаты Млынарскай было паўнюсенька. Гэтыя чатыры пані ахвяроўваліся тэлегледачам як дзяжурны святочны падарунак, як ваўняны швэдар, цёплы, ды куслівы, дадзены дзецям пад ёлачку замест чаканай цацкі.

Своеасаблівую ролю адыгрывала ў гэтыя святы прэзідэнціха. Паяўлялася яна (часам нават і ў камерцыйных тэлеканалах) быццам Дзед Мароз — каб не мяшаць сюды і Святога Мікалая — як Першая дама, якая нясе дапамогу хворым дзецям. Калі тэлегледачы заселі абедаць у першы дзень свят, атрымалі на закуску амаль паўгадзінны рэпартаж аб Іаланце Кваснеўскай, пастаўлены венгерскай рэжысёркай Мартай Месарош (прыватна жонкай кракаўскага акцёра Яна Навіцкага). Мая знаёмая, якая зайшла да мяне на святочны абед, спаглядаючы адным вокам на фільм і ватыканскія падарожжы прэзідэнтавай ды паміж адным а другім кусам качкі з яблыкам, кінула:

— Яна яшчэ будзе святой.

Пэўна, так не будзе. Аднак, тэлебачанне робіць усё, каб склалася такое ўражанне. Мабыць, штосьці на справе тут ёсць, бо некаторыя палітычныя каментатары быццам паўжартам кажуць, што на будучых прэзідэнцкіх выбарах будзе стартаваць Іаланта Кваснеўская, паколькі яе муж, Аляксандр, не будзе ўжо балатавацца — па канстытуцыйных прычынах. Пачакаем, пабачым. Да выбараў маем сама меней яшчэ адны святы. Адно вядома, што з аднолькавай палітыкай TVP.

А, дарэчы. Як тэлебачанне на кагосьці накінецца, будзе эксплуатаваць яго аж да нудоты. Для прыкладу, ёсць такая група акцёраў, якая паяўляецца бесперапынна на розных тэлеканалах у шмат якіх фільмах і праграмах. Да нядаўна быў гэта Багуслаў Лінда. Надалей ёсць — Кшыштаф Кольбергер. Цяпер паставілі на Мацея Штура, Паўла Вільчка ці славутую Марцысю з серыяла „Златапольскія" — Магду Стужынскую. Калі палічыць усіх фарсіраваных тэлебачаннем акцёраў, то разам з кожнай іх хваляй, іх лік абмяжоўваецца да дваццаткі-трыццаткі, пры 10 тысячах прафесійна актыўных польскіх акцёрах. Яшчэ іншай групай акцёраў і асоб папулярызаваных наймацнейшым сродкам масавай інфармацыі з'яўляюцца г.зв. „дзеці". У аколіцах саракоўкі — як Агата Млынарская ці Гражына Тарбіцкая („маладая Лёска"), да дваццацігодкаў, як успомнены Мацей Штур ці Матэуш Даменцкі. Іх эксплуатуюць на розныя спосабы, у кантэксце іх уласных талентаў і ўмеласцей, а таксама і сямейных. Шкада мне толькі маладых людзей без прозвішча і ўплывовага (добра пастаўленага і дарагога) агента, якія не маюць магчымасці прабіцца, прадзерціся цераз тэлевізійны экран. Трапляюць найчасцей у правінцыйныя гарады або снуюцца па сталічных карчмах і банкетах, разлічваючы на поспех у чарговых кастынгах, і так па прынцыпе абстаўленых той трыццаткай-саракоўкай. А, можа, і на іх вуліцы засвеціць сонейка?

Гэта ўсё, ад масава папулярызаванай дабрачыннай дзейнасці Іаланты Кваснеўскай і сітуацыі акцёраў, ёсць таксама мерай польскага капіталізму. Мала аб гэтым гаворыцца, бо яшчэ ёсць большыя абшары нашай бяды і гора. Людзі, якія на хвалі, даюць ілюзію, каб хоць на хвіліну ад іх адбіцца. Толькі ці гэтыя людзі маюць быць усё тыя самыя? Мабыць, так. Урэшце, мы самі гэтага хочам, — хочам бачыць знаёмых з тэлеэкрана за святочным карпам і пасля вяртання з нуднай ды ўтомнай работы. А калі каму не падабаецца, можа выключыць тэлевізар і выйсці на вуліцу.

Мацей Халадоўскі

Фота АНДРЭЯ ГРЫГАРУКА

Зіма ў Белавежскай пушчы і яе ваколіцах (Ліпіны, Гайнаўка)

Пачатак зімы

Ува ўсім свеце эколагі гавораць пра агульнае ацяпленне клімату. Магчыма, гэта і праўда, але па-мойму гэтая прыродная з'ява развіваецца вельмі павольна, а нават некалі вяртаецца да ранейшага. Доказам маёй тэорыі — сёлетняя зіма. Яна пачалася вельмі марозна.

Белавежская пушча зусім пабялела. Усе дрэвы пакрыў шэрань, а лясныя сцяжынкі ўслаў пушысты белы дыван. Тоненькія галінкі бяроз, якія павіслі ўніз, выглядаюць як вадаспады ў горах. У час шпацыру трэба ўважліва ступаць, бо пад снежнай пярынай можа быць лёд, на якім лёгка пакаўзнуцца і зрабіць сабе шкоду. На снезе цяпер можна часцей пабачыць сляды звяроў, чым людзей.

Не толькі ў самой пушчы красуецца зіма. І возера Семяноўка паддаецца марозу. Ён закаваў цэлае Семяноўскае вадасховішча лёдам, які мае, паводле звестак, якія я атрымаў ад рыбакоў, сантыметраў сорак таўшчыні. Дзякуючы гэтаму я меў магчымасць пашпацыраваць па пакрытай пухкім снегам паверхні возера. Цяжка адрозніць, дзе канчаецца неба, а пачынаецца белая прастора возера.

Гэтыя краявіды я адчуў на сваім целе, бо, як гаворыцца, прамёрз да самых касцей.

Андрэй Грыгарук

Большыя падаткі

У час сесіі Рады горада Гайнаўкі, якая адбылася ў снежні 2002 года, завязалася гарачая дыскусія наконт падаткаў. Найбольш засцярог было ў адносінах да пазямельнага падатку, які бурмістр Анатоль Ахрыцюк прапанаваў павысіць з 7 грошаў за квадратны метр на 15 грошаў (першапачаткова бурмістр прапанаваў 23 грошы). У сувязі з агульнапольскімі пастановамі, у некалькі разоў трэба было паменшаць падатак ад будынкаў, якія выкарыстоўваюцца для патрэб аховы здароўя. Іншыя падаткі бурмістр прапанаваў павысіць на некалькі працэнтаў. Дырэктары вялікіх прадпрыемстваў і прыватныя прадпрымальнікі, якія прыйшлі на сесію, прапанавалі пакінуць падаткі на мінулагоднім узроўні. Паводле іх, павышаныя падаткі могуць давесці да банкруцтва прадпрыемстваў і росту беспрацоўя.

Бурмістр Анатоль Ахрыцюк паінфармаваў, што з-за фінансавых складанасцей гайнаўскія прадпрыемствы не заплацілі ў гарадскую касу падаткі ў памеры 1 мільёна 190 тысяч злотых, што абмежавала гарадскія інвестыцыі. Бурмістр адзначыў, што ў Гайнаўцы самыя нізкія падаткі ў параўнанні з суседнімі гарадамі (пазней аказалася, што радныя Бельска-Падляшскага ўстанавілі пазямельны падатак памерам 10 грошаў за квадратны метр). Анатоль Ахрыцюк абяцаў прааналізаваць магчымасці абмежавання колькасці штатаў у гарадской адміністрацыі. Прапанаванае павышэнне падаткаў крытыкавалі радныя правых груповак і прагаласавалі супраць яго. За павышэннем падаткаў галасавалі ўсе радныя ад СЛД-УП і БНВК, якія састаўляюць разам 15 асоб у 21-асабовай радзе. Радныя рашыліся таксама на невялікае павышэнне падаткаў ад сродкаў транспарту і сабак.

Вельмі складанымі аказаліся новыя бланкі для аплаты падаткаў. Радныя ад БНВК Яўген Янчук і Яўген Сачко прапанавалі вызначыць працаўнікоў адміністрацыі, якія ў магістраце будуць тлумачыць жыхарам Гайнаўкі як налічваюцца падаткі і як запаўняць бланкі пераводаў. Гэтую прапанову абяцаў выканаць бурмістр горада.

Аляксей Мароз

Без акон, без дзвярэй...

Падарожнічаў я ў канцы снежня мінулага года з Беластока ў Чаромху. На гарадскім аўтобусе дабраўся я на чыгуначны прыпынак Беласток-Стадыён. Стаяла марознае надвор'е, да ад'езду цягніка заставалася больш за паўгадзіны часу. Вырашыў зайсці ў пачакальню. Калі я апынуўся на пероне, сваім вачам не паверыў: будынак пачакальні, без акон і дзвярэй, з разбуранай сцяной з боку перона, палохаў падарожных сваім выглядам. Цяжка апісаць словамі тое, што я ўбачыў.

— Калі і чаму сцяну разабралі? — запытаў я білетнага касіра.

— Некалькі месяцаў таму, — растлумачыў мне мужчына. — Адміністрацыя чыгункі палічыла, што зашкліць вокны і дзверы каштаваць будзе даражэй, чым разбурыць сцяну. Пры тым санэпідэмстанцыя не будзе чапляцца за бруд і балаган у пачакальні.

З гэтага відаць, што Прадпрыемства чыгуначных пасажырскіх перавозаў у Беластоку у сваёй дзейнасці кіруецца выключна эканамічнымі прынцыпамі, не зважаючы на сваіх кліентаў, якія вымушаны карыстацца транспартнымі паслугамі дзяржаўнай чыгункі. Адміністрацыі выгадней пазбавіцца клопату, ліквідуючы пачакальню, чым рамантаваць і даглядаць яе, каб стварыць пасажырам дастойныя ўмовы падарожжа. Асноўная справа для іх — узяць ад пасажыраў грошы за праезд; а на астатняе — наплываць! Няважна, што пасажыры чакаюць цягніка ва ўмовах, якія можна ахарактарызаваць трыма словамі: бруд, смурод і ўбоства.

Цяпер у чыгуначнай дакументацыі запісана, што на чыгуначным прыпынку Беласток-Стадыён няма пачакальні, толькі навес, які ахоўвае пасажыраў ад сонца або непагоды. Такі дашок лягчэй прыбіраць, чым пачакальню.

Ужо некалькі гадоў цягнікі паміж Беластокам і Чаромхай рухаюцца з хуткасцю 30 км у гадзіну. За тры апошнія гады на гэтай лініі былі выменены тысячы шпалаў, у выніку чаго паправіўся тэхнічны стан чыгуначнага пуці. Пара ўжо адмяніць абмежаванне хуткасці цягнікоў, што паправіць камфорт падарожжа і прывядзе да павелічэння колькасці пасажыраў на гэтай лініі. Рашэнне аб павышэнні хуткасці цягнікоў прымае суполка ПЛК. Беластоцкае Прадпрыемства чыгуначных пасажырскіх перавозаў павінна падтрымаць пастулаты лакальных самаўрадаў Гайнаўшчыны аб адмене абмежавання хуткасці цягнікоў на лініі Беласток — Чаромха. Калі так не станецца, выдадзеныя на працягу трох гадоў грошы на рамонт пуці будуць выкінуты ў балота.

Уладзімір Сідарук

Вінцук Гадлеўскі — святар і палітык

Мінае шасцідзесятая гадавіна смерці Вінцука Гадлеўскага, аднаго з найбольш выразна акрэсленых беларускіх палітыкаў. Дакладна невядома калі Гадлеўскі нарадзіўся, ні калі загінуў. У дзвюх беларускіх энцыклапедыях пішацца, што нарадзіўся ён 16 лістапада 1888 г., у дзвюх іншых — што 16 лістапада 1898 г. У кніжных даведках можна яшчэ сустрэць інфармацыю, што нарадзіўся ён 16 снежня, пры тым адны аўтары паведамляюць, што было гэта ў 1888 г., другія, што ў 1898 г. Дату смерці Вінцука Гадлеўскага ніхто яшчэ не ўстанавіў. Вядома, што быў арыштаваны немцамі ў Мінску 24 снежня 1942 г. Забілі яго праўдападобна на пачатку студзеня 1943 г. у Трасцянецкім лагеры каля Мінска.

Вінцук Гадлеўскі закончыў у 1912 г. Віленскую духоўную каталіцкую семінарыю, а чатыры гады пасля Пецярбургскую духоўную акадэмію (гэтыя даты паказваюць, што нарадзіўся ён у 1888 г.). У Пецярбургу пачалася яго праца на беларускай ніве, якая стане неадлучнай часткай жыцця Вінцука Гадлеўскага. Душпастырскую працу пачаў як вікарый пры кафедральным касцёле ў Мінску, дзе як першы святар гаварыў казанні на беларускай мове. Пасля лютаўскай рэвалюцыі ў Расійскай імперыі Гадлеўскі ўдзельнічаў ува ўсіх дзеяннях у карысць адраджэння беларускага нацыянальнага жыцця і пабудовы незалежнай дзяржаўнасці. Быў членам Беларускага нацыянальнага камітэта, арганізатарам І З'езда беларускіх каталіцкіх святароў, удзельнікам І Усебеларускага з'езда ў снежні 1917 г., сябрам Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, заснавальнікам і ідэолагам Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, рэдактарам „Крыніцы", выкладчыкам беларускай семінарыі ў Нясвіжы.

У 1920 г. Гадлеўскі вярнуўся ў Вільню, дзе, як прадстаўнік Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, уваходзіў у склад Беларускага нацыянальнага камітэта. Прымаў удзел у арганізацыі беларускага нацыянальнага руху на Віленшчыне, змяшчаў аналітычныя артыкулы ў „Крыніцы". „Наш народ няздольны да змагання на два франты, — пісаў. — Змагаючыся тут з паланізацыяй, ён няздольны да змагання з камунізмам — і дзеля гэтага арыентуецца на Усход. Змагаючыся там з камунізмам, ён, магчыма, арыентуецца на Захад, думаючы, што тут шчасце... І гэтак цягнецца ягонае жыццё".

Гадлеўскі жыў ідэяй аб'яднання ўсіх беларусаў вакол нацыянальнага і дзяржаўнага будаўніцтва. Быў перакананы, што народы могуць развівацца і паспяхова будаваць сваю будучыню толькі ў сваёй дзяржаве, але дзеля гэтага патрэбная супольная нацыянальная ідэя, без якой не магло быць вартаснай літаратуры, навукі, мастацтва ні цывілізацыйнага прагрэсу. „Нацыя, — пісаў, — якая адказалася б або не імкнулася б да поўных правоў зь іншымі народамі, ня ёсьць поўнавартаснай нацыяй і не заслугоўвае на імя нацыі". Падкрэсліваў, што не можа быць нацыі без нацыяналізму. Аднак нацыяналізмам лічыў супольную волю сяброў аб'яднаных супольнай ідэяй, падняць свой народ на вышэйшы ўзровень палітычнага і эканамічнага бытавання. „Такога творчага нацыяналізму, — пісаў, — ніхто спыніць не мае права, ні свой, ні чужы".

У 1924 г. віленскі епіскап Юры Матулевіч назначыў Вінцука Гадлеўскага пробашчам парафіі ў Жодзішках, што на Віленшчыне. У беларускамоўным каталіцкім асяроддзі стаў ён рэалізаваць сваю ідэю, праводзячы багаслужбы на беларускай мове. Для прыхільнікаў польскага слова была асобная літургія і казанне. У рапарце епіскапу Матулевічу (пісаным на беларускай мове) падкрэсліваў, што калі адпраўляецца багаслужба на беларускай мове „тагды людзей поўны касцёл", а калі на польскай — тады прыходзіць 25-30 чалавек. Поспех Гадлеўскага быў адначасова прычынай яго няшчасця. Польская адміністрацыя праводзіла палітыку асіміляцыі беларусаў. Усіх каталікоў лічылі палякамі. У такіх умовах улады не пераносілі дзейнасці Гадлеўскага. Памянялася таксама духоўная ўлада ў Вільні. Мясцовым архібіскупам стаў эндэк Рамуальд Ялбжыкоўскі. Неўзабаве некалькіх парафіян пачалі пратэставаць супраць беларускай мовы ў жодзішскім касцёле. Пад святыняй з'явілася паліцыя з кулямётам.

Першы раз арыштавалі Гадлеўскага 25 чэрвеня 1925 г. за парушэнне канстытуцыйнага парадку, прапагандаванне сярод вернікаў ідэі беларускай дзяржаўнасці, у склад якой мелі быць далучаны ўсходнія ваяводствы Польшчы. Сябры сабралі грошы і за адпаведнай сумай вызвалілі яго з віленскай турмы. Але не спыніў ён свае дзейнасці ў Жодзішках. Другі раз арыштавалі яго 30 верасня 1925 г., трэці раз — 1 сакавіка 1926 г. Віленскі акруговы суд прыгаварыў яго на 2 гады зняволення ў варшаўскай турме на Макатове, у якой трымалі найбольшых злачынцаў.

Вызначаны новым пробашчам у Жодзішках ксёндз Рамуальд Дроніч так пісаў архібіскупу Ялбжыкоўскаму: „Najdostojniejszy Arcypasterzu i Ojcze Najukochańszy! W Imię Ojca i Ducha Św. Amen. Ja, niegodny sługa Boży, przysięgam i obiecuję Panu Bogu Wszechmogącemu, w Trójcy Świętej Jedynemu, Najświętszej Pannie co w Ostrej świeci Bramie, że nie będę odprawiał jakichkolwiek nabożeństw w języku białoruskim, ani też mówił kazań w tym języku. Tak mi dopomóż Panie Boże i Niewinna Męka Zbawiciela mego Amen".

Пасля турмы Гадлеўскі вярнуўся ў Вільню, дзе быў капеланам у шпіталі і прэфектам у школе пры кляштары бернардзінак. Перакладаў на беларускую мову „Новы запавет". Прыглядаўся антыбеларускай палітыцы, якая праводзілася ўладамі і маральнай карумпаванасці беларускіх дзеячаў. Пры канцы трыццатых гадоў выступіў з ініцыятывай заснавання Беларускага нацыянальнага фронту. Адчувалася ўжо атмасфера вайны і Гадлеўскі лічыў, што трэба быць падрыхтаваным да вялікіх змен у геапалітычнай сітуацыі вакол Беларусі. Ні палякі, ні рускія — лічыў — не былі зацікаўлены вырашэннем беларускай праблемы. Адзіным рэальным саюзнікам маглі быць толькі немцы.

Калі Чырвоная Армія заняла Вільню, Гадлеўскі выехаў у Каўнас, а пасля жыў у Варшаве і Берліне, дзе арганізаваў Беларускія нацыянальныя цэнтры. У сталіцы Нямеччыны працаваў таксама ў рэдакцыі Беларускага радыё. Летам 1941 г., калі немцы занялі Беларусь, пераехаў у Мінск і як галоўны школьны інспектар у цывільнай нямецкай адміністрацыі стаў арганізаваць беларускае школьніцтва. Сваю дзейнасць лічыў пачаткам пабудовы беларускай дзяржаўнасці, якая мела ўзнікнуць у супрацоўніцтве з гітлераўскай Нямеччынай. Гадлеўскі імкнуўся пераймаць ад немцаў як найбольш улады. Лічыў, што трэба бараніць мірнае беларускае насельніцтва перад камуністычнымі партызанамі і карнымі акцыямі фашыстаў. Толькі беларуская ўлада, паводле яго, магла стрымаць развіццё камуністычнага падполля і эсэсаўскія пацыфікацыі. Разам з Іванам Ермачэнкам стварыў Беларускую народную самапомач, па структуры падобнай на дзяржаўную адміністрацыю. Але немцы, як аказалася, не хацелі ствараць у 1942 г. беларускай дзяржаўнасці. Гадлеўскі, як галоўны архітэктар гэтага плана, заплаціў найвышэйшую цану.

Яўген Мірановіч

Мілавідзкая бітва

Адносна найбуйнейшай бітвы паўстання 1863-1864 гг. у гістарычнай літаратуры няма адзінага меркавання ні пра колькасны склад паўстанцаў і царскіх войскаў, ні нават пра тое, на чыім баку была перамога. Праліць святло на гэтую падзею нацыянальнай гісторыі могуць архіўныя сведчанні. Што ж сцьвярджаюць дакументальныя крыніцы?

У маі 1863 г. у пушчы паміж паштовымі станцыямі Мілавіды і Чамёлы Слонімскага павета Гродзенскай губерні пачалі збірацца значныя сілы паўстанцаў. Яны пачалі прыводзіць мясцовае насельніцтва да прысягі на вернасць Цэнтральнаму нацыянальнаму камітэту. Расійскія ўлады атрымлівалі пастаянныя данясенні на гэты конт і рыхтавалі карную акцыю.

20 мая 1863 г. са Слоніма выйшлі тры роты Старайнгерманландскага пяхотнага палка. На выхадзе з горада атрад быў падзелены на два аддзелы на чале з падпалкоўнікам Булгарыным і маёрам Ягоравым, якія рознымі шляхамі пайшлі да Грудапаля, які знаходзіўся за 4 вярсты ад паўстанцкага лагера. Адначасова выйшлі дзве роты з Нясьвіжа пад камандаваннем маёра Радава. Са слонімскага атрада ім насустрач даслалі мужыка з запіскаю атакаваць паўстанцаў з боку Мілавідаў пры першых стрэлах. Аднак роты з Нясьвіжа не падышлі да ночы 22 мая, і Булгарын вырашае атакаваць без іх.

Мясцовасць садзейнічала паўстанцам, якія да таго ж у пэўным сэнсе паспелі асвоіцца ў балотным гушчары. Толькі за $^3/_4$ вярсты ад лагера была паляна, астатні ж лес уяўляў сабою багну і непраходныя завалы з дрэваў. Паляна давала царскім войскам магчымасць весці атаку з двух бакоў.

Наступ пачаўся пасля таго, як узлесак быў абстраляны карцечнымі снарадамі. Увагу паўстанцаў ад асноўных сіл расійскае камандаванне спрабавала адцягнуць барабанным боем, аднак гэта не дапамагло — паўстанцы ведалі непадступнасць сваёй пазіцыі і ўпарта трымаліся. Праз дзве гадзіны царскія войскі ўжо вымушаны былі ўвесці ў бой рэзервовыя сілы, аднак таксама не здолелі пераадолець супраціўленне. У выніку бой быў спынены і царскія войскі з-за значных стратаў вымушаны былі адступіць.

Паўстанцы ж, не чакаючы, пакуль падыдзе расійскае падмацаванне з Нясвіжа, у ноч на 23 мая 1863 г. пакідаюць лагер, і 2-3 тысячы чалавек разыходзяцца па Пінскіх, Бярэскіх і Слуцкіх лясах з надзеяй зноў злучыцца. Захаваліся прозвішчы тых людзей, якія камандавалі паўстанцамі ў бітве. Гэта былі Лянкевіч, Ландэр і Лукашэвіч. Матэрыяльную падтрымку атраду аказваў памешчык Юндзіл.

Такім чынам, перамогу ў гэтай бітве атрымалі паўстанцы. Болей за тое, панесеныя страты практычна не адбіліся на той дзейнасці, якую яны праводзілі сярод мясцовага насельніцтва, у прыватнасці прывядзенне да прысягі і папаўненне атрадаў новымі людзьмі. Царскія ж войскі па-ранейшаму не маглі гэтаму перашкодзіць яшчэ некаторы час.

Зміцер Чарнель

Крыніца: *Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне, ф. 1713, в. 1, спр. 2.*

„Героі" і „бандыты"

Адгалоскі

Абодва гэтыя паняцці пазначыў я двукоссем, бо ў сапраўднасці было інакш, чым сёння пішуць і расказваюць у школах дзецям. Цяпер усюды пачуеш як за дэмакратычную Польшчу змагаліся ўзброеныя аддзелы AK-WiN і NSZ пасля заканчэння II сусветнай вайны і як народная ўлада іх за гэта мардавала. Затое ніхто, апрача мяне, нідзе ні разу не заікнуўся, што гэтыя „героі" ў час вайны не пайшлі памагаць антыгітлераўскай кааліцыі дабіваць фашыстоўскіх агрэсараў у Берліне. А наадварот, памагалі немцам біць тых, хто з-пад Леніна ішоў, каб супольна з Савецкай Арміяй вызваляць Польшчу.

Прачытаўшы артыкул Яўгена Мірановіча „Праўда пра герояў" („Ніва" н-р 50 за 2002 год), не мог я вытрываць, каб не адазвацца, хаця ўжо не адзін раз пагражалі мне, што пашкадую таго, што пішу. Раз на вуліцы аддубасілі мяне, а пасля па тэлефоне абяцалі зрабіць са мною тое, што з Чаўшэску, калі не перастану пісаць „tych bandyckich kłamstw".

А мне хочацца запытаць, ці „бандыты" дзяржаўнай бяспекі легальнай улады ў час арышту члена нелегальнай арганізацыі, або супрацоўніка гэтай арганізацыі арыштоўвалі ягоную сям'ю і палілі хату? А „барацьбіты" за польскі народ не пашкадавалі спаліць малых дзяцей з іх бацькамі і хатамі. І то без ніякіх асноў. Не, больш пытанняў не будзе, бо адзін прыклад адносін сённяшніх улад і каталіцкага кліру да „герояў" і „бандытаў" заладзіць усё. Помнік АКаўцам у Варшаве пасвяціў папа Ян Павел II, а памардаваным тымі ж „героямі" праваслаўным „бандытам" з вялікімі цяжкасцямі толькі цяпер удалося паставіць на могільніку ў Бельску-Падляшскім сціплы помнічак.

Інстытут нацыянальнай памяці арганізавалі толькі на тое, каб судзіць „бандытаў" ПНР, а „герояў" з лесу ачысціць з усіх злачынстваў. Сябра ІПН у Нараўцы сёлета сказаў, што: „Owszem, były wyroki śmierci, ale tylko na tych, którzy biegali do radzieckich władz, aby Białostocczyznę dołączyć do BSRR i na agentach bezpieki". Яны проста нічога не саромеюцца?

Васіль Петручук

Чэрвень у жніўні (2)

(пачатак у папярэднім нумары)

Перад будынкам Музычнай школы стаіць новая скульптура Станіслава Манюшкі. Разьбу музыканта выканаў Генадзь Матусевіч.

— З афіцыйнага боку мы пачулі толькі прэтэнзіі і крытыку, — кажа Вольга. — Уладам не спадабалася, што Манюшка ў акулярах. Сказалі: разьба не рэалістычная і не заплацілі за яе ні капейкі.

Скульптура Станіслава Манюшкі

У такіх мястэчках, як Чэрвень, манаполію на мастацкі густ далей маюць эксперты па ідэалогіі. Сярод „слушных" помнікаў ёсць скульптура падпольшчыцы М. Матусевіч (сугучнасць прозвішчаў выпадковая), партызанкі Л. Шамецька, згаданы ўжо помнік Леніну, помнік Фелеганаву (арганізатару партызанскага руху ў Беларусі), помнік герою СССР Барыкіну.

Савецкая сімволіка Чэрвеня выклікае розныя пачуцці. У яе моц не вераць нават камуністы. Моладзь замест назваць героя па імені і заслугах — іранічна заўсміхаецца.

* * *

Генадзь і Вольга Матусевічы змагаюцца за справу чалавечага гонару, яны вяртаюць гістарычны воблік Ігумену. У самым цэнтры, ля Музея баявой славы (там у асноўным культ савецкай улады) стаіць скульптура Ігуменні — легендарнай заснавальніцы горада. Яе паставілі ноччу, раніцай разьбу асвяціў ксёндз з Мінска і ўлады былі „пастаўлены перад фактам". У будучыні тут хочуць будаваць касцёл.

— А гэта наш часовы касцёлік, — паказваюць на аблезлы вагон з жалезнымі кратамі ў вокнах і крыжыкам над уваходам. Раз у месяц прыязджае святар і адпраўляе імшу на беларускай мове. Мова прыцягвае мясцовых інтэлігентаў і моладзь хрысціцца ў католікі.

У горадзе будуюць ужо мураваную царкву, аднак пабудова з-за недахопу сродкаў доўжыцца і мясцовыя энтузіясты традыцыі не могуць дачакацца, калі над іх „царкоўным" мястэчкам зайграюць велікодныя званы. Дзейнічаюць таксама тры баптысцкія малітоўныя дамы.

— Генадзь будзе ў нас дырэктарам на могілках, — жартуе Вольга. Мастак змагаецца за агароджу для могілак. Ад жылых будынкаў раздзяляе іх вузкая палоска зямлі.

— У нас самавольства, хто як хоча так і капае магілы. Крадуць жалезныя крыжы, аздобы. Ніхто спецыяльна не абураецца беспарадкам, хаця могілкі супольныя, хаваюць на іх праваслаўных, католікаў, пратэстантаў і камуністаў. Людзі маўчаць, ім усё адно. Памёр, пахавалі — і Бог з табой!

* * *

З часам, калі пад кіраўніцтвам Вольгі і Генадзя шпацыруем па горадзе, бачым яго другі воблік. У цэнтры, пры самым Доме ўрада, захавалася гістарычная камяніца, у якой нарадзілася Марыя Мякота — маці Максіма Багдановіча. На будынку рэльефавая скульптура Генадзя: Marie Mater Craine — Мадонна з дзіцяткам, над якой выява Пагоні. Сто метраў далей дом, у якім у час апошняй вайны жыў кампазітар Мікола Равенскі. Праўдападобна тут Равенскі напісаў музыку да рэлігійнага гімна „Магутны Божа". У час вайны музыка служыў рэгентам у мясцовай царкве. Дом пазначаны мастацкай табліцай Генадзя. Паскольку пра сувязі Багдановіча і Манюшкі ўспамінаецца ў мясцовым музеі, імя Равенскага замоўчанае.

Дом, у якім жыў Мікола Равенскі

Ні словам не ўпамінаецца пра Хаіма Суціна. Сусветнай вядомасці жывапісец нарадзіўся на Ігуменшчыне ў недалёкіх Смілавічах у 1893 годзе. Яго карціны захоўваюць галерэі найбагацейшых краін свету, у асноўным ЗША. Хаім Суцін апантана маляваў дрэвы, што міжвольна ўнушае міфалагічны краявід Ігуменшчыны, *дзе на пачатку панавала пушча*. Мастак са Смілавіч асацыюецца з Чэрвенем праз колер — ён праславіўся як фанат чырвонага колеру.

Вольга і Генадзь у майстэрні

На пытанне: які самы каштоўны ў вас экспанат — працаўніца музея кажа з гонарам:

— Несумненна, косць маманта!

* * *

У майстэрні Генадзя Матусевіча, якая ўяўляе сабой цесны пакойчык, стаяць скульптуры ваяроў родам з легендарнай мінуўшчыны. На момант забываем пра Чэрвень і яго кашмар разнабою. Перад вачыма карціны Генадзя: „Пагоня", „Амаранты", „Млечны шлях". Карціны намаляваныя ў найлепшай традыцыі Рушчыца і Драздовіча.

— Нашым уладам мастак непатрэбны, — кажа Вольга. — Яшчэ не было так, каб за нейкую разьбу або карціну заплацілі.

Матусевічы жывуць з дня на дзень. Усё часцей думаюць пакідаць бесперспектыўны і абыякавы для іх творчасці і змагання Чэрвень.

Вольга сама родам з Брэстчыны. У Чэрвень прыехала па назначэнні на пост дырэктара мясцовага дома культуры. За ангажаванасць у незалежніцкую дзейнасць яе роля абмежавалася да працы тэатральнага інструктара дзіцячага калектыву „Залатая пчолка". Не наракаюць, а ведаюць дзе і калі жывуць.

Нас уразіла адвага Матусевічаў, прыгажосць і праўдзівасць. Аказваецца, Вольга — карэнная падляшоха.

— Мае бацькі родам з Беласточчыны, — кажа. — Маці з Дашоў, бацька — з Чаромхі, а дзявочае прозвішча Назарук. Яшчэ да вайны бацькі пасяліліся на Брэстчыне, а пасля міжволі апынуліся ў БССР. Вольга ўмее гаварыць „пасвойму" і, калі чуе пра беластоцкую „Ніву", ажыўляецца:

— У нас сваякі ў Беластоку, — і тут зноў нечаканасць, — бо сваякі таксама жывуць па вуліцы... Станіслава Манюшкі.

Ганна Кандрацюк
Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК і ЛЕНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

Масавы ўдзел

У школьных элімінацыях IX выпуску Алімпіяды беларускай мовы, якія адбыліся 16 снежня 2002 года, прыняло ўдзел каля 170 белліцэістаў Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Да школьных спаборніцтваў прыступілі амаль усе вучні чацвёртых класаў. Белліцэісты пісьмова адказвалі на пытанні па гісторыі беларускай літаратуры і пісалі сачыненне на выбраную тэму. Большасць вучняў рашылася пісаць працы на аснове твораў „белавежцаў". Толькі некаторыя выбралі аналіз верша Алеся Разанава „Снег".

— Былі вельмі добрыя працы і слабыя. Цешыць вялікая колькасць удзельнікаў школьных элімінацый і добрая падрыхтоўка вучняў трэціх класаў. Для найстарэйшых вучняў алімпіяда была праверкай ведаў перад экзаменамі на атэстат сталасці па беларускай мове, але не ўсе вучні чацвёртых класаў добра падрыхтаваліся, — заявіў член школьнай камісіі, настаўнік беларускай мовы Ян Карчэўскі.

49 удзельнікаў, якія найлепш напісалі пісьмовыя працы, перайшлі да вуснага этапу школьных элімінацый алімпіяды, што 18 снежня 2002 года праходзіў у Гайнаўскім белліцэі. Вучні ў ходзе жарабёўкі атрымоўвалі білеты з двума пытаннямі і адказвалі на адно выбранае. Пытанні па беларускай літаратуры і „свабодных тэмах" тычыліся польска-беларускіх сувязяў, фальклору, школы, сям'і і навакольнага асяроддзя. Да раённага этапу алімпіяды перайшло 29 асоб.

— Вучні добра гаварылі па-беларуску. Расказвалі пра сваю школу, горад, айчыну, нацыянальнасць і сяброў, — сказала Вольга Сянкевіч. — Менш ведалі пра мастакоў. Хаця ведалі, хто такі Лявон Тарасэвіч, не патрапілі расказаць пра яго творчасць.

Вучні, якія рашыліся адказваць па беларускай літаратуры, найчасцей расказвалі пра „белавежцаў", Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча і Максіма Танка.

Аляксей Мароз

Разнароднасць дасягненняў

У час Агляду мастацкіх дасягненняў вучняў падставовых, гімназічных і сярэдніх школ, які ў канцы лістапада адбыўся ў Бельскім доме культуры, запрэзентаваліся дзеці і моладзь Бельскага павета.

Вучні выступілі з тэатральнымі сцэнкамі, дэкламавалі вершы, спявалі, танцавалі, паказвалі мастацкія працы і іншыя дасягненні. Сярод падставовых школ найлепшую ацэнку атрымала ПШ н-р 4, другое месца занялі вучні ПШ н-р 5, а трэцяе — ПШ н-р 2. Дадатковую ўзнагароду атрымаў Комплекс спецыяльных школ. У групе гімназістаў найвышэйшую ацэнку атрымалі вучні з бельскіх гімназій н-р 1 і 2.

Сярод вучняў сярэдніх школ камісія найвышэй ацаніла працы і выступленні вучняў Комплексаў школ н-р 2 і 4. Другое месца заняла моладзь Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання і Комплексу школ н-р 3. Выступленні старэйшых вучняў на сцэне былі больш прафесійнымі. Вучні з Комплексу школ н-р 2 паказвалі праекты па будаўніцтве, архітэктуры і разнароднай вопратцы. Моладзь Комплексу школ н-р 4 прадставіла вырабы з саломы, карціны і гафтаваныя працы. Вучні з Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання падрыхтавалі беларускія стравы з бульбы, агародніны і грыбоў. Моладзі і старэйшым госцям вельмі смакаваў вясельны каравай.

(ам-з)

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Навучэнцы IV „а” і V „ц” класаў ПШ н-р 4 у Беластоку з настаўніцай Алінай Ваўранюк

Клас ёсць КЛАС-С-С!

Сябры з IV „б” класа ПШ н-р 4 у Беластоку мараць аб беларускай гімназіі. Не дзіва! Многія з іх сябры ад першага „класа” прадшколля.

— Наш клас вясёлы і дружны, — кажуць самі пра сябе. Папраўдзе, тут усе індывідуалы, дзяўчаты памастацку сплятаюць інтрыгі, хлопцы, як сапраўдныя мужчыны, ужо гавораць пра палітыку. Усе яны добрыя вучні і многія з іх выдатнікі. Усе вывучаюць пяць моў: беларускую, польскую, англійскую, нямецкую, стараславянскую.

Пяць асоб ходзіць дадаткова ў музычную школу, дзе вывучаюць ігру на піяніна, скрыпцы, віяланчэлі.

У класе 13 навучэнцаў беларускай мовы. Родная мова для большасці гэта любімы прадмет. Урокі, якія вядзе настаўніца Аліна Ваўранюк, жывыя і цікавыя. Апрача ўрокаў, многія дзеці сустракаюцца ў тэатральным гуртку. Зараз рыхтуюць новую п’есу. Пад відам птушак дзеці прадстаўляць бытавыя сцэны з сямейнага і грамадскага жыцця.

— Наша прадстаўленне ёсць *бомба*! — кажуць, аднак, не хочуць загадзя рассакрэціць ягоны сюжэт.

Клас, у якім вучацца нашы сябры — беларуска-польскі. З нагоды свята Каляд рыхтуюць абрадную сустрэчу. Беларускія дзеткі будуць прадстаўляць свае калядкі і вершы. Найбольш каштоўнае тое, што гэта яны самі прыдумалі і прапанавалі сваёй выхавацельцы „экуменічны” характар сустрэчы.

І яшчэ адна цікавінка.

Паклоннікі апавядання „Дзённікі Міколы” сустрэнуць у гэтым класе жывых яго персанажаў: нештодзённага Міколку, паслухмянага Ярка і жулікаватага Тамаша, дзівачку Вераніку і магічную Аню. Ёсць меркаванні, што пад асобай настаўніка Вожыка скрываецца любімы тут настаўнік нямецкай мовы. Ёсць падставы меркаваць, што Нор Узі гэта ПАНІ(!), і, каб было цікавей — яна не з’яўляецца настаўніцай пластыкі, толькі...

Разам з чацвёртым класам сфатаграфаваліся сяброўкі з пятага класа: Оля Максімюк, Магда Саковіч і Аня Яканюк. Дзяўчаты прывіталі мяне сваімі вершамі, якія сказалі (ці, можа, заспявалі) рэпуючы. Усім падабалася!

Зорка

Польска-беларуская крыжаванка № 2

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 50: Сом, харыст, бяроза, мат, жалейка, плакат, ігра, адаптар. Боб, лі, мяжа, рака, холад, рай, кіт, смага, юта, ар, тур.

Узнагароды — **аўтаручкі** — выйгралі: **Агата Балтрамюк** з Дубін, **Лукаш Нічыпарук** з Бельска-Падляшскага, **Тамаш Міхалюк** з Чыжоў, **Галіна Ільяшук** з Нарвы, **Паўліна Тэслюк** з Новага Корніна, **Ася Казёл** і **Мацей Налівайка** з Гарадка. Віншуем!

Вершы Віктара Шведа

Драпежны звер

Просіць настаўніца на ўроку:
— Скажыце, дарагія дзеці,
Які, мо ведамы навокал,
Драпежны звер жыве на свеце?

— Па-мойму курка, — кажа Лена, —
Драпежная заўжды, вядома,
Штодзень яна дзярэ страшэнна
Нашу зямельку каля дому.

Адкуль у жываце дзіцятка

Спытала матку Анжэліка:
— Чаму ў цябе жывот вялікі?
Дзяўчынцы адказала матка:
— Я маю ў жываце дзіцятка.

Пачуўшы гэтае малая
Матулі нейк не давярае,
Ізноў пытае яе смела:
— А можа ты дзіцятка з’ела?

Міра Лукша

Зорка

Валік сядзеў пад акном і доўга ўзіраўся па-над дамамі на ўсё цямнеючае неба. Чамусьці не запалілі яшчэ лямпу на слупе, што стаяў у агародзе суседа. Ва ўсёй вёсцы толькі чатыры ляпмы, а запальваюцца яны аўтаматычна — летам вельмі позна, зімою — як толькі надыходзіць змрок. А да Новага года — ночы якія доўгія! Зрываешся на школьны аўтобус у змрок, вяртаешся — таксама цёмна. Нават калі ты ў першым класе. Хатай нацешышся адно ў святочны перапынак або зімовыя канікулы. Альбо калі, не дай Бог, захварэеш. Толькі незамоцна, бо тады прыемнасці ніякай няма, і мама і бабуля перажываюць. А так — ляжыш, адпачываеш, думаеш... Сузіраеш плямы сонца, як перасоўваюцца з аконных шыб па сценах. Альбо ў пакрытай марозам дзівоснымі кветкамі шыбіне прахукаеш круглую як залатоўку праталінку і пазіраеш на сінічак-эквілібрыстак на кавалку саланінкі... А ўвечары...

— Ты што так прыстаў да таго акна? — здзівілася мама. — Уключыў бы тэлевізар.

— Зорку шукаю.

— Ты што, цемень такая... Хмарна. Нічога не ўбачыш.

— Ёсць! Мам, глядзі! Падае?!

— Падумай пра штосьці, каб збылося! Толькі пра адно.

У Валікавай галаве маланкава прамільгнулі ўсе свежыя мары... Паехаць з мамай у Дыснейленд? Атрымаць ад Дзеда Мароза... горны веласіпед... самы сучасны! З татам хутчэй сустрэцца! Ага! Што там лісты ці пасылкі з тае Амерыкі! Што можна пахваліцца перад калегамі!

— Мама, ты пра тое самае падумала, праўда?

— Так, пра тату, — уздыхнула мама і, узяўшы сына за плячо, хутка адвярнула ад акна. Каб не прыкмеціў, што гэта не зорка бліснула, падаючы, а памаленьку па небе сунецца самалёт.

Уладзімір АРЛОЎ, Адкуль наш род

Беларусь і Напалеон

Няспраўджаныя надзеі

Заняўшы беларускія і летувіскія землі, Напалеон аб'явіў іх вызваленымі ад расійскага прыгнёту і не скупіўся на шчодрыя абяцанні.

Не ўсе разумелі, што французскі імператар вёў сваю гульню. Ён марыў пра панаванне над усім светам, а лёс таго ці іншага падуладнага народа мала хваляваў яго.

За абяцанне аднавіць Вялікае княства Літоўскае Напалеон патрабаваў 100-тысячнае войска і велізарную колькасць харчовых прыпасаў для сваёй арміі. Часовы ўрад Княства не стаў гаспадаром краіны, а мусіў быў падпарадкоўвацца французскім камісарам.

Сяляне марна чакалі ад Напалеона адмены прыгоннага права. Замест гэтага ён падпісваў усё новыя і новыя загады пра паборы. Французскія аддзелы ездзілі па вёсках, пакідаючы за сабою пустыя каморы, хлявы і адрыны. Пад выглядам добраахвотных ахвяраванняў салдаты збіралі з кожнага двара па два пуды сена і саломы і па пяць пудоў жыта і аўса.

У жніўні Напалеон выдаў указ, згодна з якім яго Вялікая армія павінная была атрымаць ад беларускіх губерняў 53 тысячы кароў і 628 тысяч тон збожжа.

Надзеяў на Напалеона заставалася ўсё менш і менш. Сяляне браліся за косы ды сякеры і стваралі партызанскія аддзелы, каб бараніцца ад рабункаў.

Паспяховымі нападамі на французаў праславіліся беларускія партызаны з прыдзвінскай вёскі Жарцы. Сялянка Хадора Міронава некалькі разоў адважна выпраўлялася ў заняты французамі Полацак і прыносіла адтуль важныя звесткі для расійскага штаба.

Напярэдадні вядомай Барадзінскай бітвы французскі імператар вымушаны быў накіраваць ажно дзесяць тысяч жаўнераў на дапамогу свайму 12-тысячнаму віцебскаму гарнізону, які партызаны трымалі ў аблозе.

(працяг будзе)

Падзяка

Мяне завуць Радак Сельвясюк. Атрымаў я ўзнагароду ў конкурсе „Класікі". Узнагародай была кніга „Адкуль наш род" Уладзіміра Арлова. З яе можна даведацца аб многіх гістарычных фактах з жыцця славутых беларусаў, як: Сімяон Полацкі, Мікола Гусоўскі, Кастусь Каліноўскі. Найбольш зацікавіла мяне паўстанне Тадэуша Касцюшкі. Я вельмі ўдзячны „Зорцы" за гэтую ўзнагароду.

Радак Сельвясюк, III „б" кл. Гімназіі ў Орлі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вучні пятага класа з настаўніцай Нінай Куптэль

Ездзяць на экскурсіі

Вучні пятага класа Падставовай школы ў Дубінах вучацца беларускай мове чацвёрты год. На ўроках і пасля заняткаў ахвотна рыхтуюцца да школьных урачыстасцей. У час сямейнага фэсту, арганізаванага ў школе, паказвалі сцэнку „Восеньскія гульні". На ўроках беларускай мовы, якія вядзе Ніна Куптэль, вучні карыстаюцца новымі кніжкамі і дапаможнікамі — відэа- і аўдыёкасетамі. Разам з выхавацелем Міраславам Койлам і настаўнікамі ездзілі на экскурсіі ў Беласток, Нараўку, знаёміліся з гісторыяй свайго наваколля. Наведвалі школьных сяброў у Арэшкаве і Новым Беразове. Моніка Яноўская і Моніка Шарэйка з нагоды Дня дзіцяці ездзілі ў Варшаву на сустрэчу з прэзідэнтам Аляксандрам Кваснеўскім. Самымі лепшымі вучнямі па беларускай мове з'яўляюцца Моніка Яноўская, Паўліна Чэпель, Наталля Васілюк, Моніка Шарэйка, Іаанна Данілюк і Эльвіра Скепка.

— Ходзім на заняткі беларускай мовы, бо гэта цікавыя ўрокі, — заяўляе Моніка Яноўская.

Дома большасць вучняў размаўляе на гутарковай беларускай мове.

(ам-з)

Аня Іванюк

Дарога

Абрывісты шлях,
поўны каменняў,
што цягнецца
цэлымі стагоддзямі.
Доўгі, вузкі,
часам цяжка
яго перайсці —
— як жыццё.

Ірына Рэйт

Турбота

— Чаго, Галачка, сумуеш,
Узіраешся ў акно?
— Вецер-сівер моцна дуе,
Завіруха йдзе ў сяло.
— У дождж — чобаткі на ножкі,
На снег — цёплы кажушок...
— Мне не холадна, ды кошка,
Наша Кіца мерзне ў бок.
Усё гуляе, шпацыруе,
Нават ноччу ёй не сон.
Ты здароўя не шкадуеш! —
Такі Кіцы мой папрок!
Ты прастудзіш, Кіца, лапкі,
Лепш на печы пасядзі!
Мо пашыць табе што з латкі...
Босай лапкай не хадзі!
Мне ўжо ў галаве не гулі:
Маёй котцы — вецер у хвост!
Ты шкарпэткі хоць абуеш?!
Або шапачку ў мароз?!

З украінскай пераклала Міра Лукша

У Арэшкаве любяць гульні ды шануюць традыцыю

26 лістапада ў Пачатковай школе ў Арэшкаве пасля заняткаў дзеці ўрачыста адзначалі Анджэйкі; дату святкавання Анджэйкаў падабрана старанна, з аглядкай на Піліпаў пост. Пасля заняткаў, у 13 гадзін, дзеці з настаўнікамі спаткаліся ў гімнастычнай зале. Дырэктарка школы Гражына Бэрэзняк прывітала ўсіх ды расказала, як даўней варажылі.

Раней „анджэйкавую" тэму абмяркоўвалі ў класах. Для прыкладу, дзеці II-III класаў знаёміліся з варажбою „Ідуць боты". Скідалі абутак і стаўлялі яго ў радочак у напрамку дзвярэй. І той асобе, чый боцік першы даходзіў да парога, гаварылася са смехам, што першая адгуляе вяселле. У іншых гульнях дзеці пісалі на картачках імёны дзяўчат або хлопцаў, або назвы аўтамабільных марак, а пасля шляхам жараб'ёўкі цягнулі імя будучага мужа або жонкі ці марку самахода, якім будуць раз'язджаць у будучыні.

Варажба працягвалася і ў час дыскатэкі, наладжанай вучнямі старэйшых класаў. Варажылі з картаў, з далоні, з шара. Аказалася, што гаданне будучыні з'яўляецца складанай справай, патрабуе ўмеласці, а яго вынік выклікае вялікія хваляванні. Было многа радасці, смеху і размоў.

У перапынках між гаданнямі танцы і спевы прэзентавалі вучаніцы II класа Эвеліна Дунда і Караліна Навіцкая. Выконваліся сцэнкі, падабраныя самімі дзецьмі і прыгатаваныя пад кіраўніцтвам выхавацелькі Лідзіі Панькоўскай. Пасля дыскатэкі дзеці разышліся дамоў.

* * *

У Пачатковай школе ў Арэшкаве дзеці не толькі захапляліся добрай анджэйкавай гульнёй, але і грунтоўна рыхтаваліся да Піліпавага посту.

— Варажэнне ў школе разглядаем як вясёлую гульню, бо і дзеці не ўспрымаюць іх усур'ёз, — гаворыць Лідзія Панькоўская. — Анджэйкі звязваем з надыходзячым постам. Нават загадзя, 28 лістапада, у час экскурсіі ў Белавежу, дзеці ўжо не спявалі песень. З 4 снежня, ад свята Увядзення ў храм Багародзіцы, дазваляецца спяваць калядкі. У час посту ў нашай школе не арганізуюцца ні вечарынкі, ні дыскатэкі, ні іншыя гульні. А спевы прымеркаваны да Каляд.

У час посту рыхтуемся да школьнай куцці. Святочнае навячэр'е ладзім у апошні дзень каляндарнага года. З дзецьмі гатовім у школьнай кухні рыбную ежу, булачкі. Пасля заняткаў ідзем у гімнастычную залу і там супольна спажываем за прыгожа прыбранымі сталамі. Бацюшка частуе просвірай. Спяваем калядкі і абменьваемся навагоднімі пажаданнямі. І дзеці пасля ўсё гэта выдатна захоўваюць у памяці, згадваюць, што такой смачнай рыбы яшчэ не елі. Такія абрады ладзім у нашай школе ўжо некалькі гадоў.

Міхал Мінцэвіч

Фота ЛІДЗІІ ПАНЬКОЎСКАЙ

Для цыганскіх гаданняў дзяўчаты пераапрануліся ў „цыганскія" касцюмы

Фота КРЫСТЫНЫ КАСЦЕВІЧ

Анджэй Антчак у час прэзентацыі даведніка

Запрашэнне ў Белавежскую пушчу

У Публічнай гарадской бібліятэцы ў Гайнаўцы адбылося спатканне з інжынерам кантролю Белавежскага надлясніцтва Анджэем Антчакам, аўтарам турыстычнага даведніка *Белавежская пушча і наваколле**, які выйшаў з друку летам гэтага года.

Турыстам даведнік раскажа пра дарогі і сродкі транспарту, якімі з цэнтральнай Польшчы можна даехаць у Белавежу і суседнія мясцовасці. Карыстаючыся прыкладзенай да выдання картай можна дабрацца ў кожнае месца, якое згадваецца ў даведніку. Анджэй Антчак змясціў у выданні геаграфічна-прыродазнаўчыя, гаспадарчыя, культурныя і гістарычныя інфармацыі прыгодныя турыстам. Даволі дакладна прадстаўлена ў ім прырода Белавежскай пушчы з птушкамі, звярынай і багатай расліннасцю. У даведніку многа каляровых фатаграфій. Даецца інфармацыя пра мясцовасці, распаложаныя вакол пушчы, і іх архітэктурныя асаблівасці — старыя цэрквы і свецкія будоўлі. Наведвальнікі Белавежы даведаюцца таксама пра культурныя мерапрыемствы на Гайнаўшчыне. Аднак самымі важнымі для турыстаў могуць аказацца інфармацыі пра гатэлі, вясковыя агратурыстычныя кватэры і турыстычныя шляхі. Прыгожае выданне заахвочвае ўзяць даведнік у рукі.

На жаль, у некаторых месцах даведніка прадстаўлены няпоўныя і памылковыя інфармацыі аб цэрквах. Не пры ўсіх фатаграфіях храмаў, пабудаваных у перыяд уніі, аўтар памячае, што гэтыя цэрквы цяпер праваслаўныя. У чытача, які дакладна не разбярэцца ў даведніку, можа скласціся ўражанне, што некаторыя цэрквы на Гайнаўшчыне надалей з'яўляюцца грэка-каталіцкімі храмамі (цэрквы ў Вярстоку — с. 181, Новым Беразове — с. 182 і Пухлах — с. 184). У даведніку двойчы даецца фатаграфія царквы Іаана Багаслова з Новага Беразова з памылковымі подпісамі.

Аляксей Мароз

*Andrzej Antczak, *Puszcza Białowieska i okolice*, Dom Wydawniczy Benkowski, Białystok 2002.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Другакласнікі і настаўніца Аліна Якімюк

Паэтычныя песні бардаў

Быць не мужнаю, а шчаслівай

У бардаўскай песні ёсць некалькі азначэнняў: гэта і творчасць спеўных паэтаў, і адзін з відаў музычнага ўвасаблення прафесійнай паэзіі, і паэтычнае самавыяўленне музычных публіцыстаў. Ва ўсялякім выпадку і першае, і другое, і трэцяе аб'яднанае тут высокім словам ПАЭЗІЯ. Дый самое слова бард узятае з моваў кельцкіх, дзе азначае спеўную птушку. Бо так старажытныя кельты называлі вандроўных паэтаў, якія выконвалі не толькі лірыку кахання, але і гістарычныя балады, сатырычныя фельетоны.

Традыцыя беларускай бардаўскай песні налічвае таксама не адно стагоддзе, а найбольш красамоўны вобраз народнага песняра створаны Янкам Купалам у хрэстаматыйнай паэме „Курган":

Кажуць, толькі як выйдзе і ўдарыць як ён
Па струнáх з неадступнаю песняй, —
Сон злятае з павек, болю ціцыцца стогн,
Не шумяць ясакары, чарэсні.

Як заўважаюць многія даследчыкі, найбольш значнае месца ў грамадскай свядомасці, а разам і найбольш масавы распаўсюд беларуская бардаўская песня набыла на мяжы 80-90-х гадоў мінулага стагоддзя (С. Золатаў у „Музыкальной газете" № 2, 6.01.2002 г.). І ўжо тады маладым прадзюсерам, выдаўцом і журналістам Кастусём Елісеевым быў створаны адмысловы выдавецкі лэйбл „Limas", які акурат і ўзяў пад сваю апеку гэты папулярны жанр. Бардаў пачалі збіраць на вялікіх фестывальных сцэнах, рабіць канцэртныя ды студыйныя запісы, выдаваць кніжкі і касеты.

Нашае знаёмства з альбомам Ланы Медзіч „Урэшцерэшт"* распачынае цыкл публікацый пра жаночую плынь у беларускай бардаўскай песні, якая таксама ўяўляецца шматграннай і каларытнай.

Лане Медзіч, вельмі тонкай, зграбнай і чуллівай прадстаўніцы інтымнай лірыкі урбаністычнага кантэксту, бадай, пашанцавала больш за ўсіх. Гэты альбом хоць і створаны з запісаў першай паловы 1990-х гадоў, але ўяўляе сабой дыхтоўны студыйны рэліз. Тут не давялося, як у архіўных выданнях Сяржука Сокалава-Воюша, перапрацоўваць вэрхал самаробных хатніх і канцэртовых запісаў, таму рэмайстарынг гукарэжысёра Уладзіміра Бярберава выглядае нібыта як лічбавы прадукт ад пачатку.

Што да назвы альбома „Урэшцерэшт", дык каб не песня з такім жа тытулам, многія шукалі б сэнсу ў самае сітуацыі вакол беларускай бардаўскай песні, калі першыя дыхтоўныя масавыя выданні з'явіліся праз 10 гадоў пасля росквіту гэтага жанру ў нашай краіне: ужо з'ехаў у Амерыку Сяржук Сокалаў-Воюш, ужо пакінула Радзіму Лана Медзіч, а тут нарэшце яны і ў тыраж выйшлі. „Урэшцерэшт".

Праўда, паслухайце саму песню, бо ў ёй чулае сэрца таленавітай бардэсы ці не выяўляла яшчэ тады прарочае бачанне свайго лёсу:

У рэшце рэшт супакойся,
І крылы складзі, і рукі —
Вялікія справы будуць
І гучныя галасы.
Вялікія справы пройдуць
Далёкім і сумным сонцам,
Жахліва прыгожым сонцам,
Ды толькі зусім чужым.

Зрэшты, цяпер ёй свеціць не „зусім чужое сонца" Расіі, да якога яе цягнула і ў беларускіх вершах ад пачатку: яе штурхнула да творчасці Таццяна Нікіціна, а глыбока патрыятычная песня „Менску" ў гэтым альбоме захавала падзагаловак „Наследаванне М. Цвятаевай".

Кожнай вуліцы твар кожны
Не забыць, не прайсці міма.
А скажы, тут яшчэ можна
Быць не мужнаю, а шчаслівай?

Прыгадваючы конкурс гімнаў Мінска на так званым „сталічным тэлебачанні", я дзіўлюся, чаму яны не заўважылі такіх пранікнёных, шчырых, пяшчотных песень Ланы Медзіч, у якой прысвячэнняў роднаму гораду ёсць і болей:

Паветра пахне мокраю зямлёй,
Зямля кастрамі, а кастры мінулым.
Гарызанталі чорных менскіх вулак,
Вы зрэдку абяцаеце спакой.

Праўда, іх заўважылі больш пільныя адмыслоўцы. І тая ж „Музыкальная газета", прыгадваючы бардаўскі выбух пачатку 1990-х, пісала: „Пасля эмацыйнага накалу бардаў-трыбунаў выступ Ланы Медзіч на фестывалі „Орша-92" — нібыта бальзам на душы слухачоў, якімі апаноўвае зусім іншы настрой — пяшчота. У гэтым сутнасць ейных песень, дарэчы, сталых і меладычна, і паэтычна. Сярод іх і „Жаль не пакіне мяне", і „Запомніць імёны", і „Паветра пахне", і іншыя.

Альбом „Урэшцерэшт", які не так даўно з'явіўся ў музычных шапіках (пераважна Таварыства беларускай мовы), увабраў ажно 26 песень, поўных неверагодна шчырага пачуцця і вольнага разумовага палёту. Кожны знойдзе ў гэтых песнях радок для сябе ў пакутлівых пошуках сэнсу жыцця. А мяне, заўсёднікa тых бардаўскіх тусовак 10-гадовай даўніны, што пісаў натхнёныя рэпартажы ў маладзёжнай прэсе, асабліва і асабіста кранулі такія радкі, прасякнутыя нейкім пачуццём патаемнай еднасці:

Божа, будзь ласкавы з тымі,
Хто натхненне мне прыносіў,
Хто мяне да неба ўзносіў...

Дарэчы, фундатар і аўтар ідэі гэтага выдання Кастусь Елісееў, які таксама пачуе нешта сваё асабістае ў далікатным „Пажаданні" сам пільна папрацаваў над яго мастацкай аздобай, стварыўшы ў шэрагу іншых узораў маштабную серыю беларускай жаночай бардаўскай лірыкі (Лана Медзіч, Вольга Сідарук, Лера Сом, Вальжына Цярэшчанка ды іншыя), знаёмства з якой мы яшчэ працягнем.

Вітаўт Мартыненка

Гулялі ў тэатр

Вучні другіх класаў Падставовай школы н-р 2 у Гайнаўцы, якія вучацца беларускай мове, выступілі ў час урока з тэатральнай сцэнкай. Іх сябры памагалі выступаць, спяваючы беларускую песню. Аліна Якімюк, якая вядзе заняткі з наймалодшымі дзеткамі, у час гульняў знаёміць іх з простымі беларускімі словамі. Вучні рыхтуюць тэатральныя сцэнкі, любяць слухаць казкі і глядзець мультфільмы. Пасля дзеткі знаёмяцца з беларускімі літарамі, вучацца чытаць і пісаць.

У школе беларускай мове вучацца 94 асобы, а найбольш з шостых класаў. Старэйшых вучняў знаёміць з ёй Зофія Кердалевіч. Многія вучні пасля заканчэння школы ідуць вучыцца ў Гайнаўскую белгімназію.

Аляксей Мароз

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Інтэр'ер царквы ў Шчытах-Дзенцялове

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Вонкавы від шчытоўскай царквы

Іконы ў жаласным стане

Шчыты, вёска, якая сёння складаецца з дзвюх: Шчытоў-Дзенцялова і Шчытоў-Навадвораў, была заснавана ў XVI ст. руска-літоўскім родам Шчытоў. Пазней была яна ўласнасцю Іжыковічаў, Браніцкіх і, з другой паловы XVIII ст. — Вангерскіх.

Росквіт вёскі і наваколля наступіў дзякуючы сям'і Вангерскіх, добрых адміністратараў і гаспадароў, шчодрых насельніцтву. Маёнтак Дзенцялова ад Яна Клеменса Браніцкага атрымаў ва ўзнагароду за верную службу палкоўнік Андрэй Вангерскі, а пасля ўнаследаваў ягоны сын Ян Вангерскі, дворны падкаморы і камергер. Як паведамляюць тагачасныя дакументы, у 1785 годзе Ян Вангерскі пабудаваў драўняную уніяцкую царкву і званіцу. Гэтыя, цяпер праваслаўныя, помнікі духовай і матэрыяльнай культуры служаць вернікам да сённяшняга дня, аднак неадкладнай рэстаўрацыі патрабуе аснашчэнне храма.

У 1810-1817 гг. Ян Вангерскі пабудаваў у Шчытах і новы двор (адкуль і назва Шчыты-Навадворы). Побач двара, у якім даў працу людзям з наваколля, заснаваў і васьмігектарны парк. Маёмасць згаданага двара канфіскавалі ў 1939 годзе саветы. Дворскі комплекс захаваўся да сёння і, хаця заселены, занесены ў рэестр помнікаў даўніны, але яго стан, асабліва паўднёвай часткі, здаўна патрабуе капітальнага рамонту. Пад аховай знаходзіцца таксама захаваная частка парку. Стары двор у Дзенцялове (пабудаваны ў XV ст., спалены і адбудаваны) у 1943 годзе спалілі савецкія партызаны і на сённяшні дзень ад яго захавалася толькі адна сажалка і фрагмент парку з алеяй.

Шчытоўская царква Усячэння галавы Іаана Хрысціцеля ў міжваенны перыяд належала Арлянскаму прыходу. Тадышнія польскія дзяржаўныя ўлады скасавалі Шчытоўскі прыход, а ягоных вернікаў у адміністрацыйным парадку падпарадкавалі Арлянскаму прыходу. Царкоўную зямлю ў Шчытах (64 дзесяціны і 577 сажняў) у 1922 годзе ўлады аддалі ў арэнду, а царкоўныя будынкі былі заняты арандатарам. У 1930 годзе Шчыты з фальваркамі Навадворы і Дзенцялова налічвалі 504 душы. Як сведчаць метрыкальныя запісы, у 1910 годзе ў Шчытах адбыліся 98 хрышчэнняў, 15 шлюбаў і 69 пахаванняў; для прыкладу: у 1991 годзе было іх адпаведна 8, 4 і 9. Прыход у Шчытах адноўлена ў 1940 годзе.

Як вынікае з архіўных крыніц, абразы для шчытоўскай царквы пісаў прыдворны мастак Браніцкага Аўгустын Мірыс, фламандзец, які жыў у Беластоку па вуліцы Замкавай. Мірыс з жонкай жылі ў Польшчы да старасці. Ён да смерці не развучыў польскай мовы, але яму здавалася, што ўсё разумее і з кожным згаворыцца. Гэтыя абставіны спарадзілі шмат непаразуменняў анекдатычнага характару; адно з іх кранае і шчытоўскую царкву.

Калі камергер Вангерскі пабудаваў сваім вернікам царкву, ейны парах задумаў упрыгожыць храм іконай Пакрова Прасвятой Багародзіцы і ўстанавіць 1 кастрычніка свята адпушчэння ў яе гонар. Паехаў да Мірыса і заказаў ікону. Мастак згадзіўся, але яшчэ спытаў ці мае быць з дзіцяткам ці без.

— Вядома, з дзіцяткам! — заявіў парах.

Мірыс назваў цану, узяў грошы і абяцаў намаляваць карціну за тыдзень да адпушчэння. У намечаны тэрмін парах запрасіў абата базыльянаў з Супрасля, каб у суправаджэнні святароў прыехаў у Шчыты, пасвяціў ікону і адправіў святочнае набажэнства. Перад урачыстасцю парах паехаў у Беласток, зайшоў да Мірыса. Мастак завёў яго да прыкрытай палатном карціны. Аднак заміж іконы Багародзіцы парах убачыў карову з цяляткам...

— Я ж у вас заказваў ікону Пакрова, — кажа Мірысу.

— Tak, jest krowa, — адказвае Мірыс. — Pan ksiądz chciał z dziecięciem, więc jest i piękne dziecię krowy.

Доўга не маглі яны згаварыцца, але знайшоўся нехта, хто растлумачыў Мірысу, што парах хацеў абраз Апекі Божай Маці з Дзіцяткам, а не каровы з цяляткам. Мірыс, скеміўшы памылку, аддаў параху грошы і хутка дармова напісаў такі абраз, які быў патрэбны ў царкву. Намаляваную раней апальную карціну купіў фундатар царквы...

У шчытоўскім храме захавалася многа ікон з даўняга, уніяцкага аснашчэння, напр. „Зняцце Ісуса з крыжа" з колішняга галоўнага алтара, „Хрышчэнне Хрыста ў Іардане" з бакавога алтара, „Святы Ануфрый", „Апошняя вячэра", „Дзева з Дзіцяткам і анёламі", фератрон — вынасны алтарык са „Святой Сям'ёй з малым Іаанам Хрысціцелем" і „Хрыстом пакутуючым з анёлам"; іх мастацкая манера паказвае на пэндзаль Аўгустына Мірыса. Ніводная з захаваных у Шчытах ікон не нагадвае іконы „Пакрова Багародзіцы"; значыць яна не захавалася. Ікона „Апошняя вячэра" была перанесена ў храм з двара Вангерскіх.

Паводле звестак Ваяводскага аддзялення службы аховы помнікаў у Беластоку, напісаныя каля 1785 года магчымыя Мірысавы іконы знаходзяцца сёння ў жаласным стане. Аднаўлення патрабуе і стаячая перад храмам статуя сярэдневяковага святога Яна Непамука, выкананая ў 1758 годзе Янам Рэдлерам па заказе Браніцкага. Каб толькі лёсу тых помнікаў не наканавалі словы Францішка Білгарайскага, біёграфа Браніцкіх: „Якая ж паўсюдная загана ў нашай краіне, што не ўмеем шанаваць густу продкаў нашых. Пакідаем для гніцця, заміж належна захаваць". Аднаўленне будынка ўжо праведзена. Васемнаццацівечныя абразы, якія знаходзяцца ў пасляуніяцкай царкве ў Шчытах, з'яўляюцца каштоўнейшымі памяткамі жывапісу на Беласточчыне. Гэта рэдкае сведчанне дзейнасці мастакоў звязаных з як жа важным для нашага рэгіёна мецэнатам гетмана Яна Клеменса Браніцкага.

Міхал Мінцэвіч

З серыі „Вашыя і нашыя"

Дачка сказала: не!

Ад некалькіх дзён перад адчыненымі дзвярамі нашай палаты відаць была згорбленая постаць пажылой жанчыны, гадоў сямідзесяці, якая даволі энергічна прахаджвалася па калідоры. У руках яна трымала чатырохножнік, а яе спрацаванае цела ледзь паспявала за гэтай адмысловай палкай. „Пазваночнік...", — падумалася мне, а белая блузачка яе і самаробная камізэлька пераконвалі мяне, што гэта жанчына з вёскі. „Добра ведае, што рух лечыць рэўматызм", — падумала ізноў.

Неўзабаве жанчына паявілася ў нашай палаце. Якраз нейкая расіянка аж з Мардвы прынесла нам свой тавар, а той пацыентцы патрэбныя былі тапачкі. Яны пачалі размаўляць, і я ўжо ведала, што яна з „нашай" вёскі. Старалася гаварыць паруску, а выходзіла па-беларуску.

— Адкуль жа вы будзеце? — смела запыталася я, і жанчына адразу, на чыстай беларускай мове мне адказала, з якой яна вёскі. А Божачкі, гэта ж дзесяткі разоў праязджала я праз гэту вёску, а колькі пра яе пісалі калісь у „Ніве"...

— У вас там калісьці была спулдзельня, як казалі, калхоз! — выцягнула я даныя са сваёй закарэлай памяці.

— Во, дык ён яшчэ і цяпер ёсць! — адказала з гонарам жанчына.

Пасля мы сустракаліся з гэтай жанчынай на гімнастыцы і водных масажах, ветліва ўсміхаліся адна да другой, размаўлялі, і не відаць было ў яе тыповай насцярожанасці ў адносінах да незнаёмага чалавека. Жанчына была разумная, і прыемна было мне з ёй гутарыць.

Калі я запыталася, ці можна было б зрабіць з ёй размову ў „Ніве", яна, не задумваючыся, адразу сказала: „А чаму ж не?" Я ўцешылася, бо з гэтага мог бы выйсці цікавы матэрыял.

Вясковая пацыентка, адпачыўшы, хутка прыйшла ў сябе. Выпрасталася, адкінула палку. Каб так нехта з боку глянуў, дык мог бы падумаць, што нічога ёй і не баліць. Я вырашыла, што пасля нядзелі, гэта значыць пасля двухдзённага адпачынку ад практыкаванняў, я зраблю ёй здымак і яшчэ пагутарым больш грунтоўна, ну, як бы афіцыйна.

У суботу і нядзелю на калідорах і ў палатах нашага аддзялення было людна: хворых наведвалі сваякі і знаёмыя. Мода пайшла такая, што не паспеюць чалавека палажыць у бальніцу, як спяшаюцца да яго наведвальнікі. Адны гэта робяць з абавязку (каб бацька ці маці там з голаду не памерлі), іншыя — з цікаўнасці (як ён цяпер выглядае?..), яшчэ хтосьці — каб там яму, беднаму, не было сумна ў гэтым далёкім Беластоку без суседзяў-аднавяскоўцаў. Праўда, наведваць хворых можна было штодзень, але найзручней гэта рабіць у суботу і нядзелю, асабліва, калі трэба ехаць здалёк.

Да жанчыны ў белай блузцы і камізэльцы прыйшла дачка з сям'ёю. Ёй было блізка, яна жыла ў Беластоку, працавала на добра платнай пасадзе. Гараджанка поўным парам.

Пасля яе візіту адносіны жанчыны да мяне змяніліся. Яна ўжо не была такая прыветлівая, а яе позірк уцякаў кудысьці ўбок, калі мы сустракаліся. Жанчына неяк замкнулася ў сабе, не даючы мне шанцу наблізіцца да яе. Нічога кепскага не падазраючы, я ў панядзелак, як мы і дамовіліся, узяла фотаапарат і паперу і прыйшла ў шпітальную святліцу. Жанчына была апранута ў халат і глядзела фільм па тэлевізары.

Я ціхенька села на крэсла за ёю і чакала, калі скончыцца фільм. Жанчына нават не адвярнулася. Нешта вісела ў атмасферы.

Фільм цягнуўся, і я, амаль на вуха жанчыне, запыталася, ці сёння паразмаўляем. Жанчына крыху павярнула галаву ў мой бок: „Не, гаварыць не будзем!" Яна сказала гэта так рашуча, так катэгарычна, што ў мяне ўмомант стала суха ў роце. А што здарылася? „Дачка сказала, каб ніякіх гутарак больш не было!" — ва ўсёй гэтай прыкрай сітуацыі яна была прынамсі шчырая.

Я спрабавала ёй яшчэ растлумачыць, што тэкст паявіўся б у „Ніве" на праваслаўныя святы, быў бы яе здымак (нягледзячы на гады, жанчына была прыгожая), але яна толькі паўтарыла: „Дачка сказала: Не, то і ўсё!"

Мне як бы хто напляваў у душу, было сумна. Я таксама пахаладзела ў адносінах да гэтай жанчыны. Пішучы гэты тэкст, я спачатку хацела падаць імя і прозвішча гэтай жанчыны ды назву яе вёскі. Але пасля падумала: за што я мела б зрабіць ёй крыўду, за тое, што яна адразу згадзілася быць на старонках „Нівы" і трактавала мяне як блізкага чалавека... За тое, што шчыра прызналася, як усё было?..

А што дачка не захацела, каб маці паказалася ў беларускай газеце, дык можа яно і зразумела. Пэўна, яна добра памятае, па якім прынцыпе ў дзевяностых гадах скарачалі штаты на некаторых прадпрыемствах, а яе ж добрая пасада і так вісіць на валаску, бо фірма ледзь дыхае.

І так даходзім да тае праўды, якую часта чуем з вуснаў некаторых беларускіх дзеячаў: беларусы ў Польшчы з'яўляюцца настолькі беларусамі, наколькі ім быць дазваляюць.

Ада Чачуга

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Марыя Боўтрык, сястра Лёні

Магіла Раісы Шаўчэнка і Зінаіды Млечанка на могільніку ў Новым Ляўкове.

Лёня не прыйшоў

Не так даўно наведаў я 71-гадовую Марыю Боўтрык, жыхарку аднайменнай вёскі Боўтрыкі. Цікавіў мяне лёс яе старэйшага брата Лёні. Жанчына са слязамі на вачах расказала мне наступную гісторыю.

— Лёня Боўтрык нарадзіўся ў 1920 годзе. Так як астатнія вясковыя хлапчукі, рос, падрастаў і дапамагаў бацькам на гаспадарцы, а ў вольны час займаўся рыбалкай на рацэ Нарве. У школу хадзіў у Рыбакі. Ішлі гады. Юнак Лёня з равеснікамі часта наведвалі моладзь з вёскі Лука, якая раскінулася на другім беразе ракі. У Луцэ Лёня пазнаёміўся з Раісай Філіпаўнай Шаўчэнка, савецкай акушэркай. Раіса таксама часта наведвала бацькоў Лёні ў Боўтрыках. Запомнілася мне назаўсёды, як яны размаўлялі аб вяселлі, аб будучыні, калі ўжо стануць мужам і жонкай.

Далей наведаў я колішнюю жыхарку Лукі, 81-гадовую Марыю Каральчук, дачку Анны і Лукаша Віткоўскіх.

— Хадзіла я ў школу, якая змяшчалася ў хаце Якуба Смольскага. Закончыла 4 класы. У 1939 г. выйшла я замуж за Аляксандра Каральчука. У Луцэ быў медыцынскі пункт, у якім лекаркай працавала Зінаіда Млечанка, а акушэркай — Раіса Шаўчэнка. Раіса жыла ў Міхала Стоцкага. Была гэта прыгожая, добразычлівая дзяўчына. Я сябравала з Раісай. Яна была старшай дружкай на маім вяселлі. Шлюб быў у царкве ў Старым Ляўкове. 26 чэрвеня 1941 г. нарадзіла я сына Аляксандра. Роды прымала Раіса. У той час муж быў на фронце, а пасля папаў у нямецкую няволю, сядзеў у лагерах.

У 1941 годзе пачалася нямецка-савецкая вайна. На Беласточчыну прыйшлі немцы. Лёня наладзіў сувязь з савецкімі партызанамі, дапамагаў ім.

— „Не магу вытрываць, вазьміце мяне з сабой, хлопцы", кожны раз, калі ноччу савецкія партызаны заходзілі ў хату, прасіўся Лёня, — успамінае Марыя Боўтрык. — „Не рвіся, пасядзі, Лёня, дома. Нам свой чалавек і ў вёсцы патрэбны", гаварылі яны брату. Лёня не раз праводзіў партызан хмызнякамі за луг, а сам вяртаўся на панадворак, стойваўся і нерухомым ценем услухоўваўся ў начную цішыню: ці не бачыў хто, ці не чуў. А думкамі быў ён з нядаўнімі наведвальнікамі, з партызанамі. Канешне, партызанам патрэбны быў свой чалавек на месцы, — успамінае сястра Марыя. — Узяць хоць бы самога Лёню: колькі вінтовак з патронамі перадаў ён партызанам, колькі мяшкоў з хлебам ды салам пераправіў у лес.

У жніўні 1941 г. немцы ва ўрочышчы Тапілец пабілі жыхароў Лукі, у тым ліку 24-гадовую Зінаіду Млечанка і 21-гадовую Раісу Шаўчэнка. Пасля некалькіх дзён блізкія ахвяр атрымалі ад нямецкіх улад у Нараўцы дазвол на перапахаванне забітых на прыхадскія могілкі ў Новым Ляўкове.

— Калі адкапалі трупаў, — расказвае Марыя Каральчук, — сама я бачыла, як паламаныя былі рукі і ногі, знявечаныя твары маіх сяброўак з Украіны. Пры эксгумацыі быў Лёня. Ён сваімі рукамі падняў каханую Раісу, якая мела быць яго жонкай, з якой марылі аб сямейным жыцці.

„Не срабрыла воч тваіх сляза, хоць была нялёгкая мінута, ты хацела нешта мне сказаць, змоўчала, не ведаю чаму так. У глыбокай сіняве вачэй, прачытаў я пажадання словы: каб было каханне гарачэй, будзь адважным у баі суровым", — прыпомнілася Лёню ў тую мінуту.

Для партызан Лёня застаўся сваім чалавекам, таму нядоўга разважалі, куды паслаць новага партызана. Ён застаўся ў атрадзе Колі. Заданні Лёня выконваў паспяхова. Усё да выхаду на чыгунку рабіў акуратна. У выніку нямецкія эшалоны на ўсход на некалькі дзён спыняліся. Былі страты ў нямецкіх салдатах. Атрад Колі нападаў на нямецкія камендатуры. Немцы баяліся іх як агню. Вейкаўскія балоты, у якіх хаваліся партызаны з радыёстанцыяй, амаль паралельна цягнуліся ўздоўж чыгункі Семяноўка — Цісоўка. Летам прайсці па гэтах балотах было амаль немагчма. Трэба было ведаць як прабірацца, каб не апынуцца па шыю ў дрыгве. Лёня добра ведаў гэтыя лугі.

Аднак немцы пеленгавалі радыёстанцыю і познім вечарам знішчылі тое месца. У тым часе партызаны выконвалі чарговае заданне — падкладалі ўзрыўчаткі пад чыгуначныя рэйкі. Нямецкі эшалон, мінуўшы жалезны мост на шляху з Семяноўкі ў Цісоўку, пайшоў у адкос. Без радыёстанцыі партызанам дзейнічаць было цяжкавата. Лёня зноў аказаўся дзелавітым партызанам і пастараўся новую радыёстанцыю.

Атрад меў сваю зямлянку за вёскай Альхоўка, што на ўскраіне Белавежскай пушчы. Аднойчы зайшлі яны да леснічоўкі ў вёсцы. Ляснік прыняў іх, даў паесці, прасушыцца. Пасля адпачынку партызаны вярнуліся ў зямлянку. Ляснік-здраднік паведаміў немцам аб месцы прабывання партызан.

Немцы акружылі зямлянку. Пачаўся няроўны бой, у якім загінуў Лёня. Яго падабралі немцы і ляснік-здраднік. Дзе яго закапалі, ніхто не ведае.

Партызаны яшчэ доўга заходзілі да Лёневых бацькоў і суцяшалі: „Не волнуйтесь, Лёня скоро прийдёт". Але Лёня не прыйшоў. Сястра ўсё чакае весткі аб месцы пахавання брата. А можа хто-небудзь ведае, дзе знаходзіцца магіла Лёні?

Віктар Бура

Ваенныя дзеці

Успаміны Міколы ПЕТЫШУКА з-пад Чаромхі

На заходне-паўднёвым беразе Белавежскай пушчы растуць у полі пералескі, якія з давён-даўна жыхары тых ваколіц называюць Буркі і Таяўкі, з якіх вясною сплывае снег да балот называных Лазой і Галыцёй. Тады вясною выглядае ўсё як возера, і тут рай для балотнага птаства.

З гэтых балот бярэ свой пачатак рэчка Нурэц, у якой калісь было многа рыбы, а найбольш ракаў, ды, як выпраставалі рэчку, знішчылі наваколле, і прапалі яны ўсе.

За балотамі ад паўднёвага боку цягнуцца пагоркі з урадлівай глебай, на якіх расклалася з поўдня на поўнач вёска Хлевішчы. Ад яе з паўднёвага боку расходзіліся дарогі — адна ў бок Вярховіч, а далей на Камянец-Літоўскі, а другая — у Высока-Літоўск, а далей да Берасця. А на поўдзень — дарога ў вёску Тэрэхі, да якой не больш 1 кіламетра. А другая — цераз пералесак Таяўкі, да станцыі Чаромха. Каля гэтай дарогі ў 1929 годзе разбіліся хутары, між іншым — і наш, дзе стаялі хата, клуня і хлеў.

Была дзесьці палова верасня 1939 года. Быў сонечны цёплы дзень, а мы, малечы, татавы наследнікі, а было нас пяць хлопчыкаў і адна дзяўчынка, пад камандай найстарэйшага насілі дровы, а старэйшы брат складваў іх роўненька пры сцяне хлява. Раптам даляцела да нас нейкая размова. Брат выглянуў, і сказаў: „Польскае войска прыехала". Нейкі афіцэр распытваў нашага бацьку. Тата адказваў, паказваючы рукой у бок Брэста, называючы мясцовасці, якія па дарозе ў той бок. Афіцэр запісаў штосьці алоўкам. А мы, малыя, глядзелі то на яго шапку-рагатыўку, то на пояс, дзе была кабура пісталета. Гэта была для нас нагода пахваліцца калегам, што ўбачылі.

Афіцэр змераў нас вачыма і запытаўся: „A czyjeż to będzie wojsko?" Бацька адказаў: „Напэўна, польске". Афіцэр падзякаваў, аддаў салют і пайшоў да сваіх. Яны хутка паехалі ўзлескам, Таяўкамі, пасля Буркамі, урочышчам Пограб, дзе былі сенажаці, а адтуль быў добры від на вёску Хлевішчы і дарогу з Хлевішч у вёску Тэрэхі. На той дарозе стаяла нямецкая танкетка. Пачалася страляніна. Немцы пакінулі танкетку, забралі кулямёт, хацелі дабрацца ў лес. Там было польскае войска. Немцы залезлі ў старыя зарослыя акопы, з першай сусветнай вайны.

Страляніна не была працяглай. Прыйшоў да нас сусед Васіль і сказаў, што на Пограбе ляжаць забітыя немцы. Ён там быў і бачыў, і польскі жаўнер сказаў яму, што на ўскраіне Таявак, каля хутара Сцяпана Зінчука, ляжыць двух немцаў. Васіль з бацькам пайшлі туды, а мы, малыя, за імі. Бацька стаў крычаць, а Васіль кажа, што там няма нічога страшнага: „Няхай ідуць!" Салдаты ляжалі тварам уверх, у чорных мундзірах, а наўкол іх сабраўся тлум вяскоўцаў. Кавалерка шукала ружжа, ды Васіль сказаў, што забрала яго польскае войска. Падняў круглую банку і даў нам, кажучы, што гэта процівагаз. „Зрабіце, хлопцы, з гэтага рагаткі, страляйце варон, а банка будзе ў мяне на карбід". Бацька пагнаў нас дадому.

На другі дзень мы мелі ўжо свае рагаткі і пугалі з іх варон. Пасля прыйшоў Васіль і паведаміў, што той другі нямецкі салдат быў толькі паранены. Жыхары вёскі Хлевішчы зрабілі яму перавязку. Забралі яго немцы, а мёртвага пахавалі за вёскай, на ўзгорку, пры дарозе на Высокае. Вясной 1940 года прыехалі нямецкія салдаты з эскортам нямецкіх пагранічнікаў, адкапалі целы салдат і забралі ў Германію.

А летам 1941 года ўжо без эскорта ўехалі на нашу зямлю, паставілі сваю жандармерыю ў Вярховічах і на станцыі Чаромха, сталі забіраць нашых людзей на прымусовыя работы ў Германію і ў канцлагеры, а многіх пастралялі, як у Вульцы-Тэрахоўскай, дзе асталося шмат удоў і сірот. Людзі жылі ў боязі перад наступным днём, аж да 1944 года...

(заканчэнне будзе)

(лук)

Фільмавы вечар

У пачатку года прапаную тры фільмы, якія павінны быць добрай варажбой на Новы год.

„Смокінг" (*The Tuxedo*) аўтарства таленавітага рэжысёра Кевіна Донавана з Джэкі Чанам, адным з лепшых галівудскіх акцёраў, Джэніфер Лаў Гюіт і Дэбі Мезер у галоўных ролях спадабаецца кінааматарам. Гісторыя непадобная на тыя, у якіх паказваецца Джэкі Чан. Галоўны герой — Джымі Тонг, працуе шафёрам Кларка Дэўліна — вядомага бізнесмена і сакрэтнага шпіёна. На новай рабоце абавязвае толькі адзін прынцып, якога трэба прытрымлівацца Джымі — нельга дакранацца элегантнага касцюма шэфа. Што ў ім такое незвычайнае? Касцюм з'яўляецца сакрэтнай зброяй шпіёна, у чым Джымі пераконваецца, калі яго шэф робіць сабе перапынак у працы. Дэўлін перадае свой касцюм шафёру і з гэтага моманту пачынаецца сапраўдная дзея фільма, а гледачы маюць магчымасць пабачыць Джэкі Чана і яго майстэрства ва ўсходніх адзінаборствах.

„Мільянер паняволі" (*Mr. Deeds*) у рэжысуры Стывена Брыла — амерыканская кінакамедыя з мараллю. Дзея фільма пачынаецца ў малым правінцыйным мястэчку. Галоўны герой — Дзідс (у гэтай ролі Адам Сендлер) — вядзе адзіную ў горадзе піцэрыю. Папулярны і шанаваны чалавек сярэдняга росту жыве ў перакананні, што атрымаў усё ад жыцця. Сітуацыя змяняецца калі раптам атрымлівае 40 мільярдаў долараў спадчыны ад далёкага пляменніка. Пачынаюцца праблемы... Вестка аб спадчыне разыходзіцца маланкава. У мястэчка прыязджаюць журналісты, а сярод іх прыгожая Бейб Бенет (Уінона Райдэр), якая рашаецца зацікавіць гледачоў сваёй праграмы „вострымі" весткамі з жыцця новага мільярдэра, якіх папраўдзе і няма! Дзідс пастанаўляе пабачыць сваю маёмасць і накіроўваецца ў Нью-Йорк. Там пачынаюцца праблемы па зайздрасці некаторых супрацоўнікаў, якія імкнуцца пазбавіць галоўнага героя спадчыны. Ці гэта ім удасца, пабачце самі!

„Нявіннасць" (*Innocence*) — найноўшы фільм Пола Кокса — гэта рамантычная гісторыя аб сапраўдным каханні, якое вытрымоўвае нават пяцідзесяцігадовую разлуку. Галоўныя героі — Клер і Андрэас былі калісьці парай закаханых маладых людзей, але іх шчасце не працягвалася доўга. Бацька Андрэаса, якому не падабалася новая сімпатыя сына, прыказаў пакончыць з гэтым знаёмствам.Так і сталася. Кожнае з іх пачынае сваё асобнае жыццё. Толькі часам, са смуткам успамінаюць гады маладосці, каханне. Галоўная дзея пачынаецца 50 гадоў пазней, калі Клер і Андрэас сустракаюцца зноў. Аднак будучыня не выглядае так цудоўна. Паяўляецца муж, які пасля саракагадовага супольнага жыцця першы раз прыходзіць да вываду, што сапраўды кахае сваю жонку. Дарослыя дзеці герояў па-рознаму ставяцца да рамана сваіх (старых) бацькоў... Пазнаем гаспадыню Андрэаса, якая гадамі кахае яго ў таямніцы... І кіраўнічку рэстарана, якая „мае ахвоту на добрага мужчыну"... Дзякуючы такім праблемам фільм набывае новы выгляд. Пазнаем сапраўдныя праблемы, якія нясе жыццё. Пабачце самі, як завершыцца гісторыя Андрэаса і Клер!

Паўліна Шафран

Вер – не вер

Астроне, сніўся мне сон, здаецца, прадказваючы не найлепшае, хоць некаторыя мае знаёмыя, каб мяне суцешыць, тлумачаць яго не так кепска. Снілася мне, што ў мяне ёсць пасярод лесу поле. Гэтае поле — дакладна, гладка зааранае, пакрытае чарназёмам, і ні былінкі на ім, ні каменьчыка. Я яго заграбаю, здаецца, граблямі. Зямля на ім сухая. Поле — як роўны ліст паперы пасярод пушчы, недзе з паўгектара. І раптам на мяжы я ўхапіла за галінку нейкую расліну. І выцягваю з зямлі тры сцябліны несмяртэльніка, разам з карэньчыкамі. Расліны свежыя, моцна-зялёныя.

Дарагі Астроне, разгадай мой сон.

Марынка

Даражэнькая Марынка! Думаю, што твае знаёмыя не толькі дзеля таго, каб суцешыць цябе, гавораць, што сон някепскі. І лес, і поле прадвяшчаюць добрае (зялёны лес — здароўе, поспехі ў справах, багацце; поле — поспехі ў справах і гаспадарцы). Толькі поле тваё са сну пустое, хаця гладка зааранае і пакрытае чарназёмам. Нічога на ім не расце, бо зямля на ім сухая. Магчыма, што нейкі час і ў тваім жыцці была нейкая пустка, хаця ўсё, здавалася б, ёсць дзеля таго, каб дасягнуць поспехаў і шчасця.

Дык вось тая раслінка на мяжы, якую ты схапіла і выцягнула з зямлі (высветлілася, што гэта тры сцябліны несмяртэльніка) можа прадвяшчаць вялікія зрухі ў тваім жыцці. Раслінкі гэтыя былі свежыя, як пішаш, моцна-зялёныя, а гэта дае шанц на веру ў будучыню. Мо нават у бліжэйшым часе ты возьмеш шчасце ў свае рукі.

Астрон

Прыярытэт

Яшчэ месяц-два таму высылаў я пісьмо аднаго дня — напрыклад, з Нараўкі ў Беласток — і яго даручалі адрасату на другі дзень. Купляў паштовую марку за 1,10 зл. і ўсё было ў парадку. Але вось зараз пісьмы недзе пралежваюцца. Выслаў у панядзелак, 2 снежня, з пошты ў Гайнаўцы, а пісьмо даручылі адрасату праз... тыдзень. Роўна праз сем дзён! Гэта цяпер не першыня.

Каб пісьмо даручылі наступнага дня трэба наклеіць наклейку з надпісам „Priorytet" і... увага, даплаціць 70 грошаў. І вось, не чуваць было, каб цану за даручэнне павысілі, але за гэтую паслугу плацім 1,80 зл. Гэтую паштовую марку загадзя выпусцілі.

Для зацікаўленых гэтай справай (мо такія, так думаю, знойдуцца) перахоўваю тры канверты, у якіх высылаў я пісьмы ў рэдакцыю „Нівы". І было гэта не перад каталіцкімі Калядамі ці Ражджаством Хрыстовым, калі пошта завалена пасылкамі. Было гэтак 22, 25 і 26 лістапада 2002 года.

Янка Целушэцкі

Яшчэ пра Тадэвуша Касцюшку

Адгалоскі

У апошніх нумарах „Нівы" сталі паяўляцца артыкулы Уладзіміра Арлова аб гісторыі Беларусі, у якіх аўтар дапускае памылкі і тэндэнцыйна асвятляе падзеі.

У бітве пад Мацяёвіцамі 10.X.1794 г. рускімі войскамі камандаваў не ген. А. Суворaў, а ген. Ферзен. Ранены ў бітве Т. Касцюшка быў узяты ў палон, дзе ў першую чаргу быў вылечены ў лазарэце пры Петрапаўлаўскай крэпасці, а пасля з вялікім паважаннем былі прадстаўлены яму раскошныя апартаменты, у якіх ён прабываў як „польский национальный герой", разумецца, пад аховай. Цар Павел I запрапанаваў Т. Касцюшку звальненне з палону і выезд за граніцу, пры ўмове, што ён дасць цару ганаровае слова, што больш не будзе дзейнічаць супроць Расіі. Касцюшка падумаў і даў такое слова цару. Тады цар даў Т. Касцюшку з дзяржаўнай казны 30 тыс. рублёў золатам на яго далейшыя жыццёвыя патрэбы і шыкарную крытую карэту для выезду. Царыца Марыя Фёдараўна падарыла ад сябе Т. Касцюшку дарагую сабалёвую шубу. Касцюшка карэту і шубу прыняў, але, пераехаўшы граніцу, зараз з першай пошты ганарова выслаў атрыманыя 30 тыс. рублёў золатам назад цару Паўлу I. Але цераз некаторы час цар даведаўся, што Т. Касцюшка пасяліўся на далейшае жыццё ў гарадку Залюр, у Швейцарыі, дык зноў выслаў яму 30 тыс. золатам. Тым разам Касцюшка грошы прыняў, але не ўзяў іх сабе, а выслаў іх у Лондан у фонд дапамогі польскім палітычным эмігрантам.

Далей У. Арлоў напісаў, што ў 1812 г. Напалеон напаў на цара Аляксандра I. Калі б трымацца такіх метадаў пісаць гісторыю, то па аналогіі трэба было б напісаць, што ў 1939 г. Гітлер напаў не на Польшчу, а на польскага прэзідэнта Ігнацыя Масціцкага. Але Гітлер напаў на Польшчу. Таксама Напалеон напаў на Расію, а не на цара. У паходзе на Расію мелі браць удзел усе заваяваныя ім дзяржавы, а ў першую чаргу — войскі створанага ім Княства Варшаўскага. І тут успомніў ён пра Т. Касцюшку і рашыў запрапанаваць яму ўдзел у падгатоўленым парадзе. Праўдападобна, намерваўся паставіць яго на чале польскіх войскаў, прадназначаных для ўдзелу ў паходзе на Маскву. З гэтым паслаў ён свайго міністра юстыцыі Юзэфа Фуція да Т. Касцюшкі ў Залюр, каб той падгаварыў яго да ўдзелу ў чарговай напалеонаўскай агрэсіі. Але Касцюшка адказаўся. Па-першае, Касцюшка адчуў сябе звязаным словам гонару, які ён даў цару Паўлу I і атрымаў за гэта свабоду і грошы, па-другое: на Захадзе было ўжо тады вядома аб злачынствах Напалеона — масавых забойствах палонных, спальванні вёсак і гарадоў, масавых рабунках, адмене свабод, адваяваных французскай рэвалюцыяй і г.д., па-трэцяе: Т. Касцюшка ведаў, што Расія мае добрую армію і ўмелых камандзіраў, знаў кліматычныя ўмовы Расіі і паход супроць яе здаваўся яму вельмі рызыкоўным. Трэба сказаць, што Тадэвуш Касцюшка быў не толькі вельмі парадачным чалавекам, але аказаўся і дальнабачным палітыкам і вайскоўцам. Ён прадбачыў крах рызыкоўных дзеянняў Напалеона іне прыняў удзелу ў паходзе на Маскву.

Мікалай Капчук

Музейны фонд

Грамадскі камітэт пабудовы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы праводзіць збор грошай на пабудову музея. Ахвяраванні на пабудову музея (у польскай і замежнай валютах) просім пералічваць на рахунак: **PKO BP S.A. O/Hajnówka, nr konta: 26 10201332 100120228.**

Спіс чарговых ахвяравальнікаў:

5 121. Інакенцій Сідарук (Гайнаўка) ..... 36,00 зл.
5 122. Гурток ПТТК з Явожна ..... 50,00 зл.
5 123. Наталля Герасімюк (Гайнаўка) ..... 30,00 зл.
5 124. Станіслаў Бэднаж (Гайнаўка) ..... 50,00 зл.
5 125. Падставовая школа н-р 3 у Бельску-Падляшскім ..... 36,00 зл.
5 126. Дары сабраныя ў скарбонку ў Музеі ..... 222,76 зл.
5 127. Ніна Бура (Гайнаўка) ..... 20,00 зл.
5 128. Хведар Галёнка (Варшава) ..... 25,00 зл.
5 129. Ілья Агіевіч (Орля) ..... 50,00 зл.
5 130. Марыя Данілецкая (Гайнаўка) ..... 48,00 зл.
5 131. Аляксандр Харкевіч (Гайнаўка) ..... 24.00 зл.

Дзякуем.

Наш адрас: **Społeczny Komitet Budowy Muzeum i Ośrodka Kultury Białoruskiej, 17-200 Hajnówka, ul. 3 Maja 42, tel. (085) 682 28 89.**

Выстава паштовак

У малой галерэі ў Гарадской публічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы, па вуліцы 3 Мая 45, адкрылі выстаўку пад загалоўкам „Гайнаўка на паштоўках", з калекцыі Адама Чурака. Экспазіцыю можна глядзець у гадзінах працы бібліятэкі, кожны дзень (апрача нядзеляў і святочных дзён). Наогул ГПБ праце ў гадз. 10-18 і толькі ў суботы ў гадз. 10-16.

(яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2003 r. upływa 5 marca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

http://www.anekdotov.net/

Факты і высновы

Забыты генерал

Два гады пісаў раман аб Касцюшкавых прыгодах у часы Амерыканскай Рэвалюцыі, ды ўсё не набяруся смеласці занесці ў рэдакцыю. А сёлета задумаўся: „Якім чынам забыты генерал з ліцвінскай глушы аказаўся Начальнікам Паўстання?" Стаў высвятляць. Аказалася, не менш цікавая гісторыя. І вось цяпер адчуваю сорам за тое, што нікому пакуль яе не распавёў. І адначасова ў думках звяртаюся да партрэта Начальніка, наракаю: „Што ты са мной робіш, Тадэ? Колькі часу яшчэ займацца табой?" А ён маўчыць.

Ягор Конеў („ЛіМ")

Маўчыць не без падстаў. У мочараўздымныя гады XX ст. на палітычным зборы Беластоцкага злучэння нацыянал-маналітнага фронту, за высвятленне ліцвінскіх каранёў Начальніка, ваяводскі камісар устаўляў мазгі нашаму рэдактару, закарузламу ў абарыгеннай глушы: „Ніва" Касцюшку прысабечвае!

Матай на вус, Гоша.

Сідар Макацёр

Адгаданка

Як у Рыо

(Анаграмная шарада)

Пост адпасціўся і Каляды мінулі,
Пад святы ёлкі мы прыгожа апранулі,
Гірлянды пестрыя і ланцужкі ***ВІЛІ*** *навокал,*
Павесілі аздобы. І весяліцца цяпер вока,
І цешыцца душа, і нагам дае накал...
І пары ***НА*** *паркет плывуць* ***ЯК*** *яхты ў шквал,*
І як дзевяты ***ВАЛ*** *наперад яны рвуцца,*
То зноў назад, як ***РАК****, мяцельна закрунуцца.*
Патрык скача з Ізаўрай і з Параскаю Цімох,
Весяляцца Крынкі, Бельск і Беласток.
Гнуцца пад закуссю сталы, іграюць „Прымакі";
Гуляюць нашы пасля посту: паны і мужыкі.

В-6, К-8

З набору патоўшчаных літар трэба скласці рашэнне: два словы, якія ў нейкай ступені адлюструюць апісваемыя падзеі. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды. (Ш)

Адказ на крыжаванку з 46 нумара

Гарызантальна: мерлан, расіст, кабала, сава, рака, Танганыка, пуга, дама, клічка, Ніксан, задыяк.

Вертыкальна: меліса, Анка, рала, стаўка, Багдановіч, ватага, ракада, Пучыні, масляк, клан, каза.

Рашэнне: **Мечыслаў Карловіч**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Піці-есці...

Не, ужо больш не змагу! Хоць выпасціўся як след. Нават Агата, стасуючы метад доктара Кваснеўскага — адно мяса, сала ды яйкі! — на час посту адставіла тую падазроную тлушчавую дыету (зусім без хлеба, мучнога, малака і... гародніны!). Ды праўда, худзее! І лепш, кажа, ёй спіцца, без аддышкі ўзбіраецца на наш чацвёрты паверх... Ёй галава не баліць, а мне страшна робіцца: корміцца мая адзіная і незаменная жонка па дзіўных законах. Ну, але сёння я не магу глядзець ні на мяса, ні на рыбу, ні на салаты... А яна ўсё: „Еш, еш, а то змарнуецца!" То на якое ліха нарабіла столькі ўсяго? І з Куцці колькі чаго засталося, і з Каляд. У халадзільніку не месціцца, дык на балконе трымаем. А колькі бедных у Афрыцы ад голаду пухне!

Падзівілася на маё змаганне Агата, уздыхнула, і давай мяне забаўляць размовай.

— А ведаеш, Вандал, што навукоўцы ў справе навыкаў звязаных са спажываннем ежы дзеляць людзей на шэсць тыпаў.

— Ыгм, — пракаўкнуў я з чубам сялёдку пад маянэзам.

— А тыя тыпы адлюстроўваюць іх рысы індывідуальнасці.

— А як вялікая была група паддоследных? — я адклаў відэлец на талерку. А ён зваліўся на падлогу. І я дадаў з радасцю: — О, упаў. Дай Бог, госць мужчынскага полу прыйдзе.

— Еш, еш! Коля, мабыць, дома добра паабедаў. — Агата падала мне другі відэлец. — Псіхатэрапеўтка Крысціна Вэбер назірала ў час яды за групай трохсот дарослых і дзяцей. Сярод жанчын адрозніла тып „фліртуючы" — тая ўжывае ежу як інструмент. Звычайна есць яна адной рукой, адным толькі відэльцам, каб звярнуць на сябе ўвагу іншых... Еш, еш, Вань. Тып „апартуністычны" прабуе страваў з талерак іншых, падскубвае чужыя. Ну, як, смачна? Вань?

— А трэці тып — тып „апякункі". Чытаў я пра тое, Агата. Ёй найбольшая радасць — глядзець, як іншым смакуюць стравы.

Я крышку аддыхнуўся — калі гаворыш, дык не ясі.

— А сярод мужчын вылучылі тып „барца" — у час спажывання ежы быццам ахоўвае сваю талерку, ахоплівае яе рукамі, „хірурга" — той дакладна акрэслівае час спажывання, старанна падбірае прапорцыі ежы і кроіць стравы на маленькія кавалачкі... — Агата на маю талерку насунула тры ружовыя лісты паляндвіцы і лыжачкай наклала побач вяндліны хрэну з журавінай.

— Ёсць яшчэ, Агата, „дэман хуткасці" — які малады мужчына і хутка расце, таму есць хутка і шмат. А я ўжо, сонейка, не такі і дэман.

— То, можа, з іншай кадушкі, Ваня. У адной энцыклапедыі падалі, што смяротная доза алкаголю — каля 4 проміляў. Гэтая лічба, мабыць, не датычыць тутэйшых. У нас былі выпадкі 6, а нават 8 проміляў.

Я адставіў чарку-дваццаціграмоўку.

— Ёсць тры фазы алкаголнага ап'янення: узбуджэнне, успакаенне і наркатычная фаза. Ну, яна ўжо пагражае смяртэлным зыходам.

— Дык, можа, Агата, з гэтым дакладам магла б ты пачакаць прыходу Міколы...

— Святога Міколы?

— А які вам ён святы! — Коля Здунюк ужо абтупваў ад снегу боты на нашым парозе. Вось вам і падарунак — цалюткі карп па-жыдоўску! Каб не змарнаваўся.

Вандал Арлянскі

Міс вавёрка

У лесе мядзведзя Сандара Жоржавіча запанавалі шкадоба і расчараванне. Чатыры дні да Новага года ў навагоднім падарунку вавёрка Кацюша мела стаць міс лясоў, узлескаў і пушч усяго кантынента. Усе былі падрыхтаваны да гэтай важнай падзеі. Бярозавы сок у бочках на паляне толькі чакаў, каб яго адкаркаваць. Уселясное кіраўніцтва выгадна расселася на ігліцы. Сандар Жоржавіч ужо трэці раз спыніў сваю зімовую дрымоту. У гэты раз — каб асабіста сачыць за ходам падзей поспеху сваёй грамадзянкі, адначасна блізкай супрацоўніцы. Кожнае паўгадзіны аб яе поспехах даносіў яму на паляну весткі сам дзяцел Стукач, які перахопліваў інфармацыю ад гайварана Аарона, а той — ад прабываючага на пастаянным жыхарстве ў гарачым Грэйпфрутавым лесе бусла Цепцяка. Бо гэта якраз у Грэйпфрутавым лесе мела перамагчы ўсіх суперніц вавёрка Кацюша (згодна загаду Сандара Жоржавіча). Ужо два тыдні да выбараў завівала кіту, падшпільвала вушкі і практыкавала пад вокам лані Гаўрусіхі свабодны ход з лапкамі апушчанымі па баках.

— Яе перамога будзе перамогай усяго лесу, маёй перамогай. А перамагчы яна абавязана. У ніводнае з канкурэнтак няма такое пухкае кіты. Ніводная з іх не такая цудна-рудая, — меркаваў Жоржавіч, назіраючы за падрыхтоўкай вавёркі. — Яна вам усім пакажа!

Мядзведжыя надзеі разышліся па ўсім лесе. Штохвіля з-за кустоў далятала хрумстанне згрызаных у эмоцыі кіпцяў лясное браціі. Урэшце наступіла хвіліна 0. У чаканні вынікаў выбараў усё кіраўніцтва на паляне маўчала. Раптам здалёк даляцела трапятанне дзятлавых крылаў.

— Ёсць, ёсць... — задыханы Стукач уляцеў на паляну. — Яна — у дзесятцы, і то не з абы-кім! Нават з ваўчыхай з Уладзімірскага лесу!

Мядзведзь уздыхнуў з палёгкай. Адшпунтоўваючы першую кадушку бярозавога соку, шапнуў:

— Добрая вавёрка!

Узняў тост:

— Ну, за рудую, за нашу перамогу!

Кіраўніцтва цырболіла сок з лакомай радасцю. Дзяцел паляцеў па канчатковы вынік выбараў. Вярнуўся, калі не кончылі яшчэ першай бочкі.

— Жалоба, жалоба! Рудая адстала! Ваўчыха ўзяла ўсё.

Сандар Жоржавіч апусціў галаву.

— Усе былі ў змове! Зноў на мне адыграліся, зноў падставілі, зноў хацелі мяне аблысіць! Шкада толькі нашае рудое. Але я ёй усё ўзнагароджу. Старалася ж Кацюша! Напушвалася дзеля ўсяго ляснога люду, дзеля мяне! Абсыплю яе арэхамі. А што?!

* * *

Мінуў тыдзень. На паляне ад выбараў прыгажунь лясоў кантынента ўселясное кіраўніцтва не сабралася ні разу. Пазасынала ў скрусе. Толькі вуж Ззянон і змяя Ссапія прыкмецілі, як вавёрка Кацюша сарамліва пераскоквае з дрэва на дрэва. Ад суму аблезла ейная кіта.

— Ох, каб толькі адрасла да вясны... — рыдала рудая, пераскокваючы ў бок дупла, забяспечанага мядзведзем да адлігі ў арэхі. — Э, а што там!.. Можа, кіта ў мяне і лысая, ды ад голаду не гебну.

МакХолад

ISSN 0546-1960